МЕСЦА, ДЗЕ ХОЧАЦЦА НЕ ТОЛЬКІ АДПАЧЫВАЦЬ 4

ГРАМАДСТВА І МОДУ МЯНЯЎ... СПОРТ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 ЖНІЎНЯ 2023 г. АЎТОРАК № 166 (30046)

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей АЛЕЙНІК, міністр замежных спраў:

«Беларусь разлічвае на больш хуткі разгляд нашай заяўкі на ўступленне ў БРІКС, якую мы падалі афіцыйна ў маі. У ходзе нашых кантактаў з краінамі — членамі БРІКС, краінамі-партнёрамі мы атрымалі цалкам выразныя запэўніванні, што наша заяўка знаходзіцца ў прыярытэце і будзе разгледжана. Безумоўна, мы разлічваем на актыўную работу ў рамках БРІКС. Нам ёсць што прапанаваць. Перш за ўсё гэта ўстойлівае эканамічнае развіццё, стварэнне больш справядлівых альтэрнатыў плацежным сістэмам. Гэтай тэме была прысвечана асаблівая ўвага. І гэта работа будзе ажыццяўляцца як у рамках самой арганізацыі, так і пры садзейнічанні новага банка развіцця БРІКС, да якога мы таксама прыглядаемся і ў які таксама разлічваем неўзабаве ўступіць».

КЛЮЧЫ НА ШЧАСЦЕ

Фота БелТА.

Навасёлы Анастасія і Эдуард ЛАБЕЦКІЯ.

У Мёрах урачыста ўручылі ключы ад новых кватэр шматдзетным і сем'ям маладых спецыялістаў розных арганізацый і ведамстваў. У новым пяціпавярховым доме будуць жыць пяць шматдзетных сем'яў. Астатнія кватэры выдзелены ў якасці арэнднага жылля для спецыялістаў сфер адукацыі, аховы здароўя, МНС, Следчага камітэта, РАУС і іншых.

Актуальна

ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА ПАДРЫХТАВАНЫЯ

«Першага верасня свае дзверы расчыняць 2865 дзяржаўных установаў, якія рэалізоўваюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, — распавяла намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі — начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына КАРЖОВА. — За парты сядуць звыш аднаго мільёна вучняў, з іх — 110 тысяч першакласнікаў. Таксама з першага верасня адкрываюцца дзве школы-новабудоўлі. Адна — у аграгарадку Сеніца на 720 месцаў, другая — у горадзе Гродне на 1020 месцаў».

Першага верасня ва ўсіх установах адукацыі пройдуць урачыстыя мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня ведаў і пачатку навучальнага года. Тэма першага ўрока — «Беларусь і Я, дыялог міру і стваральнай працы». Ва ўрачыстых мерапрыемствах прымуць удзел вышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў.

Як адзначыла начальнік упраўлення, былі захаваны меры сацыяльнай падтрымкі вучняў, у ліку якіх арганізацыя бясплатнай перавозкі. Мясцовымі выканаўчымі распарадчымі органамі вызначаны маршруты руху дзяцей, замацаваны адказныя асобы за іх суправаджэнне.

СТАР. 3

Фота БелТА.

Прырода і мы

«Беларусы жывуць у раі, таму наша задача — захаваць яго для нашчадкаў»

На Палессі прайшоў Рэспубліканскі экалагічны форум

XVII Рэспубліканскі экалагічны форум, прымеркаваны да Году міра і стваральнай працы, прайшоў на Століншчыне 25—26 жніўня. Асноўнымі дыскусійнымі тэмамі сталі актуальныя пытанні дасягнення экалагічных Мэт устойлівага развіцця (МУР) на нацыянальным і рэгіянальным узроўнях, аспекты распрацоўкі мінеральна-сыравіннай базы Брэсцкага Палесся, падыходы да развіцця і папулярызацыі экатурызму, а таксама праблемы экавыхавання.

У шматпланавым мерапрыемстве ўзялі ўдзел высокія службовыя асобы, замежныя госці, прадстаўнікі айчынных тэрытарыяльных органаў, падпарадкаваных арганізацый Мінпрыроды, установ адукацыі і культуры, грамадскіх аб'яднанняў, маладзёжныя эка-актывісты і іншыя.

СТАР. 8

Фота Андрэя КАРАБЕЛЬНІКАВА.

КАРОТКА

- **Зарплата бюджэтнікаў у Беларусі па выніках года вырасце прыкладна на 15 %.**
- Ва ўстановах адукацыі 21 верасня адпрацуюць экстранную эвакуацыю з будынка.
- **Ozon запускае праграму фінансавай і маркетынгавай падтрымкі прадпрымальнікаў Беларусі па пунктах выдачы заказаў.**
- Легендарная «Паўлінка» адкрые новы сезон у Купалаўскім тэатры.
- **Мінадукацыі прапанавала паведаміць пра памылкі ў падручніках праз электронную форму.**

ISSN 1990 — 763X

«ЗАСТАЕЦЦА ТОЛЬКІ ВУЧЫЦЦА І ВУЧЫЦЦА»

А неабходныя ўмовы для гэтага ствараюцца

Фота БелТА.

Падчас маніторынгу падрыхтоўкі навучальных установ да новага навучальнага года стаіць мэта не толькі выявіць недахопы, але і аператыўна іх устараніць. Такім меркаваннем з журналістамі падзяліўся кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА ў час наведвання шэрагу ўстаноў адукацыі Глускага раёна.

Пры падрыхтоўцы навучальных устаноў да новага навучальнага года ў адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Адміністрацыяй арганізаваны маніторынг работы па ліквідацыі недахопаў. Па ўсёй краіне працуюць групы, якія ўзначальваюцца памочнікамі Прэзідэнта па рэгіёнах, у склад якіх уваходзяць супрацоўнікі Камітэта дзяржкантролю, Міністэрства адукацыі, Генеральнай пракуратуры. «Стаіць мэта не толькі выявіць недахопы, але і аператыўна дапамагчы ў іх ліквідацыі, каб стварыць належныя ўмовы для вучобы, бяспеку, улічыць усе пытанні — ад харчавання да падвозу дзяцей у школу», — патлумачыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Для азнаямлення з падрыхтоўкай установ адукацыі Ігар Сергеенка прыняў рашэнне выехаць у Глускі раён Магілёўскай вобласці. «Хацелася паглядзець, як тут, у беларускай глыбінцы, арганізавана гэта работа, — падкрэсліў ён. — У ходзе размовы з кіраўнікамі і педагогамі у час наведвання гарадской школы, якая выбрана ў маршруце зусім нечакана, а таксама сельскай школы я ўбачыў, што мясцовыя органы ўлады добрасумленна падышлі да гэтага пытання — сур'ёзных заўваг па гатоўнасці навучальных устаноў Глускага раёна практычна не выяўлена».

Паводле слоў Ігара Сергеенкі, дзяржава стварае максімальна камфортныя ўмовы для навучання і развіцця дзяцей, іх знаходжання ў навучальных установах — адпаведна, аддача павінна быць раўнацэннай. «Неабходныя ўмовы ствараюцца: ёсць кваліфікаваныя педагогі, выдатныя аўдыторыі, навучальны матэрыял. Застаецца толькі вучыцца і вучыцца. І нагрузка, я вам скажу, не павялічваецца, як многія гавораць. Сёлета ў выпускнікоў было ўсяго два цэнтралізаваныя экзамены, а ў мой час, 40 гадоў таму, здавалі восем экзаменаў і чатыры ўступныя. Атрымліваецца, што нагрузка была нават вышэйшая. Магчыма, узровень інфармаванасці не адказваў сённяшняму дню, але ведаў было дастаткова, каб паступіць у вышэйшую навучальную ўстанову», — адзначыў ён.

У час сустрэчы з педагагічнай грамадскасцю Глускага раёна асобную ўвагу Ігар Сергеенка ўдзяліў харчаванню навучэнцаў. Таксама тэмамі для абмеркавання сталі кадравы патэнцыял раёна, падвоз навучэнцаў, матэрыяльна-тэхнічная база навучальных устаноў, асобныя новаўвядзенні ў сістэме адукацыі.

Паводле БелТА.

Мясцовы час

У ІЎІ НЯМА ЗАВОДАЎ...

але ёсць працавітыя людзі, і гэта галоўны рэсурс

Раней невялічкае мястэчка Іўе называлі беларускім Іерусалімам. Тут стагоддзямі разам жылі прадстаўнікі чатырох асноўных канфесій — католікі, праваслаўныя, мусульмане і іўдзеі. Велічны касцёл і сёння суседнічае з мячэццю, ёсць праваслаўны храм, была сінагога. Вялікая Айчынная вайна пакінула страшны след у іўеўскай гісторыі. У 1942 годзе амаль ўсё яўрэйскае насельніцтва было знішчана нямецкімі карнікамі. Памяць аб мінулым захоўваецца ў мясцовым Музеі нацыянальных культур.

Сёння Іўе — невялічкі прыгожы горад на тэрыторыі Гродзенскай вобласці. Раён прыгажэе і паступова развіваецца. Падрабязней аб гэтым карэспандэнту «Звязды» расказаў старшыня Іўеўскага райвыканкама Ігар ГЕНЕЦ.

— Ігар Мікалаевіч, доўгі час вы працавалі ў сістэме органаў унутраных спраў. Цяжка было прымаць кіраўніцтва раёнам?

— Хачу адразу сказаць, што свае задачы мы павінны выконваць там, куды нас накіравала дзяржава. Дарэчы, гэта была вельмі цікавая прапанова, і я вырашыў паспрабаваць сябе на новай ніве. Іўеўскі раён я ведаў добра, паколькі два гады працаваў начальнікам мясцовага РАУС.

Гэтую прапанову я расцэніў як «выклік самому сабе». З пасады намесніка начальніка Гродзенскага абласнога УУС перайсці на пасаду старшыні райвыканкама — гэта сур'ёзнае выпрабаванне. Але самым важным было, як маё прызначэнне ўспрымуць людзі. Зразумела, я не мог падвесці ні былых калег, ні губернатара Гродзенскай вобласці, ні кіраўніцтва дзяржавы, якое даверыла мне такую адказную ролю.

Пэўны гаспадарчы вопыт у мяне, безумоўна, быў, паколькі на пасадзе намесніка начальніка абласнога УУС даводзілася займацца пытаннямі тылавога забеспячэння. Дадам, што я добра ведаў людзей — усё раённае кіраўніцтва, кіраўнікоў прадпрыемстваў. Гэта была сур'ёзная дапамога ў пачатку маёй дзейнасці. Многае залежыць ад каманды, з якой працуеш, а каманда ў Іўеўскім раёне склалася вельмі добрая. Тут ёсць на каго абаперціся.

Нягледзячы на тое што я нарадзіўся ў вёсцы, сельская гаспадарка для мяне была самай складаная тэмай. Вялікую дапамогу ў засваенні гэтай навукі мне аказаў першы намеснік старшыні аблвыканкама Юрый Мікалаевіч Валяваты, да якога можна заўсёды звярнуцца па параду. Важкую падтрымку аказаў і мой першы намеснік — начальнік раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Святлана Мікалаеўна Філімон — вельмі вопытны спецыяліст. Прыходзілася чытаць адпаведную літаратуру, у прыватнасці, маім настольным часопісам стала «Беларуская сельская гаспадарка». Безумоўна, за два гады гэтую навуку не асвоіш, але пэўныя азы ведаць неабходна.

— У краіне заканчваецца ўборачная кампанія. З якімі вынікамі фінішуюць іўеўскія хлебаробы?

— Як і іншыя раёны, Іўеўскі пацярпеў ад засухі. Таму і ўраджайнасць сёлета ніжэйшая, чым летась. На жаль, ганарыцца асабліва няма чым. Радуе, мабыць, тое, што раён наш заканчвае ўборку ў першай дзясятцы. Прыемна, што гаспадаркі дапамагаюць адна адной, і гэта адбіваецца на агульных тэмпах. Работа ідзе без перапынкаў, ужо пачалі сеяць рапс, хутка пачнём рыхтаваць глебу да азімай сяўбы. А што датычыцца жывёлагадоўлі, то там рабочы працэс ідзе круглы год.

— Якія змены адбываюцца ў сацыяльнай сферы — адукацыі, ахове здароўя?

— Бюджэт раёна фарміруецца паспяхова. І гэта нягледзячы на тое, што ў раёне адсутнічаюць буйныя прамысловыя прадпрыемствы. Ёсць невялікія прыватныя, якія за кошт падаткаў папаўняюць бюджэт, прычым з прафіцытам, як складваецца сёлета.

Маючы бюджэтныя сродкі, мы ў першую чаргу стараемся падтрымаць медыцыну. Напрыклад, у перыяд ковідных абмежаванняў у 2021 годзе накіравалі ў сферу аховы здароўя амаль мільён рублёў у якасці дадатковых сродкаў. Летась выдзялялі грошы на рамонт цэнтральнай раённай бальніцы, на набыццё лекаў і іншыя выдаткі.

За кошт сродкаў раённага бюджэту ў канцы мінулага года быў куплены перасоўны фельчарска-акушэрскі пункт. Са студзеня ён ужо на дарогах раёна: дапамагае медыкам абслугоўваць насельніцтва ў аддаленых населеных пунктах. Сёлета на патрэбы медыцыны дадаткова вылучылі 400 тысяч рублёў. Рамантуем вясковыя ФАПы, закупляем новае абсталяванне. У 2021 годзе ў раёне пры дапамозе вобласці быў адкрыты дзённы стацыянар у ЦРБ. У мінулым годзе за кошт сродкаў вобласці набылі новы аўтамабіль хуткай медыцынскай дапамогі.

Сур'ёзную ўвагу аддаём сістэме адукацыі. Праводзім рамонты школ, набываем для іх новае абсталяванне і мэблю. На жаль, апошнім часам дзве вясковыя школы ў раёне вымушаны былі закрыць. Проста сем'і, дзе былі дзеці школьнага ўзросту, пераехалі на жыхарства ў Іўе. У гэтых школах персаналу стала больш чым дзяцей, вось чаму яны спынілі сваё існаванне.

У хуткім часе плануем купіць вучэбна-метадычны аўтамабіль для раённага аддзела адукацыі.

У раённым цэнтры пачалося будаўніцтва новага 40-кватэрнага дома. У эксплуатацыю ён будзе ўведзены ў сакавіку 2024 года. 21 кватэра ў гэтым доме будзе выдзелена тым, хто мае патрэбу, а 19 кватэр будуць арэндным. Забяспечым жыллём урачоў, ваеннаслужачых, супрацоўнікаў сілавых ведамстваў, педагогаў.

— Моладзь ахвотна застаецца ў раёне?

— У чым спецыфіка нашага раёна — усяго за 37 км ад Іўя знаходзіцца даволі вялікі горад Ліда, 120 кіламетраў да Мінска, маршрутнае таксі даязджае да сталіцы менш чым за дзве гадзіны. А там куды больш магчымасцяў уладкавацца на добра аплачваную работу. І, тым не менш, прыкладна 65—70 % маладых спецыялістаў застаецца ў раёне.

Самы дзейсны спосаб замацаваць маладога чалавека на радзіме — забяспечыць яго жыллём. На гэта і накіраваны нашы намаганні. Мы пачалі будаваць жыллё для маладых сем'яў з дзецьмі, прадстаўнікоў бюджэтных арганізацый. Свой утульны, камфортны дом або кватэра — сапраўднае шчасце для кожнага. Калі ёсць у чалавека свой кут, то ён наўрад ці захоча яго пакідаць.

— Як мяняецца якасць жыцця людзей у Іўеўскім раёне?

— Сярод асноўных пытанняў — асфальтаванне дарог і развіццё транспартнай інфраструктуры ўвогуле. Не толькі ў раённым цэнтры, але і ў аграгарадках. Дзяржава выдзяляе вялікія грошы на развіццё інфраструктуры, але не менш адказная задача гэту інфраструктуру падтрымліваць.

Безумоўна, людзям патрэбна не толькі добрая работа, але і прыемны адпачынак. Асабліва моладзі. Таму ў нашых бліжэйшых планах — адкрыць у горадзе новае летняе кафэ, закупіць новую апаратуру для правядзення дыскатэк. Была ідэя пабудаваць у Іўі фізкультурна-аздараўленчы комплекс, але з гэтым пакуль давядзецца пачакаць.

Прыемна адзначыць, што і моладзь адгукаецца на нашы прапановы, а часам прымае непасрэдны ўдзел у жыцці раёна і горада. Напрыклад, нядаўна невядомыі была разбурана баскетбольная пляцоўка. Дык вось моладзь сама звярнулася да нас з прапановай аднаўлення аб'екта. Напярэдадні Дня горада гэта пляцоўка ва ўрачыстай атмасферы была адкрыта. А нашы маладыя актывісты, ініцыятары аднаўлення спартыўнага аб'екта, узнагароджаны памятнымі падарункамі.

Цяпер яны выступілі з ініцыятывай набыць спартыўны інвентар для мясцовага дзіцячага дому сямейнага тыпу. Такія ўчынкі можна толькі вітаць, кожная добрая справа іўеўскай моладзі заўсёды будзе падтрымана райвыканкамам. Гэта вельмі добра, калі паміж уладамі і насельніцтвам, прычым яго маладой часткай, ёсць паразуменне і наладжана ўзаемадзеянне.

Сяргей РУЧАНАЎ, фота аўтара.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Макрон: палітыка Францыі выключае прамы ўдзел у канфлікце ва Украіне

Аб гэтым заявіў прэзідэнт рэспублікі Эмануэль Макрон падчас выступлення ў Парыжы на штогадовай канферэнцыі паслоў Францыі, паведамляе ТАСС.

«Мы імкнёмся выключыць прамы ўдзел у канфлікце з Расіяй», — сказаў ён. Макрон зазначыў, што Францыя імкнецца «пазбегнуць любой эскалацыі ўкраінскага канфлікту».

Прэзідэнт таксама заявіў, што Францыя лічыць неабходным стварыць новыя пагадненні аб абмежаванні ўзбраенняў, якія нясуць пагрозу для еўрапейскай тэрыторыі. Паводле яго слоў, перыяд пасля канфлікту ва Украіне «павінен суправаджацца новымі пагадненнямі, якія ствараюць рамкі ў сферы ўзбраенняў — усіх тыпаў узбраенняў і ўсёй ваеннай актыўнасці, якая датычыцца Еўропы». «Мы павінны мець волю, каб стаць аўтарамі канцэпцыі і падпісантамі гэтых будучых пагадненняў», — сказаў Макрон.

На мінулым тыдні ў інтэрв'ю часопісу Le Point прэзідэнт краіны казаў пра тое, што Францыя не жадае паражэння Украіны ў цяперашнім канфлікце і гатовая да доўгага супрацьстаяння.

Апытанне: большасць амерыканцаў лічаць, што Байдэн стары для другога тэрміну

Звыш трох чвэрцяў амерыканцаў мяркуе, што дзейны прэзідэнт ЗША Джо Байдэн занадта стары, каб эфектыўна выконваць паўнамоцтвы кіраўніка дзяржавы ў выпадку абрання на другі тэрмін, сведчаць вынікі апытання «Асашыэйтэд Прэс — NORC», апублікаваныя агенцтвам «Асашыэйтэд Прэс».

Па выніках апытання, 77 % рэспандэнтаў заявілі, што Байдэн «занадта стары, каб заставацца эфектыўным яшчэ чатыры гады». Сярод удзельнікаў апытання з ліку прыхільнікаў рэспубліканскай партыі 89 % лічаць дзейнага кіраўніка дзяржавы занадта старым для перавыбрання, сярод дэмакратаў такое меркаванне падзяляюць 69 %.

Удзельнікаў апытання таксама папрасілі назваць асацыяцыі, якія ў іх узнікаюць пры згадванні Байдэна і былога прэзідэнта ЗША Дональда Трампа. У гэтых інтуітыўных адказах 26 % згадалі ўзрост Байдэна, а яшчэ 15 % выкарыстоўвалі такія словы, як «павольны» ці «разгублены». Пры гэтым толькі 1 % удзельнікаў апытання ўспомнілі аб узросце Трампа.

Апытанне праводзілася ў ЗША з 10 да 14 жніўня, у ім прынялі ўдзел 1165 чалавек. Хібнасць склала плюс-мінус 3,8 працэнтнага пункта.

Агульны інтарэс

Не азмрочыць бядой пачатак

Пра што нагадаюць дзецям, іх бацькам і педагогам напярэдадні 1 верасня

Набліжаецца да завяршэння летні перыяд, час канікул. Яшчэ крыху — і дзеці пойдуць у школу, зноў сядуць за парты. Займальнае баўленне часу хутка стане прыемным успамінам. Разам з тым за мінулы час вучні, аддаўшыся гульням, маглі забыцца на правілы бяспекі. Але пра іх заўсёды памятаюць дарослыя. Якія мерапрыемствы і акцыі ўжо адбыліся ці плануюцца да 1 верасня з гэтай нагоды? Пра іх расказалі кампетэнтныя спікеры падчас прэс-канферэнцыі «Правядзенне прафілактычных мерапрыемстваў па забеспячэнні бяспекі дзяцей напярэдадні новага навучальнага года».

Бяспечны маршрут «дом — школа — дом»

Пачынаючы з чэрвеня тэрытарыяльнымі падраздзяленнямі Дзяржаўтаінспекцыі былі абследаваны ўсе дарогі і вуліцы, якія прылягаюць да дашкольных навучальных устаноў, да ўстаноў сярэдняй агульнай адукацыі, а таксама да месцаў збору дзяцей: дзіцячых паліклінік, адукацыйна-творчых цэнтраў, музычных школ. Пра гэта паведаміла журналістам **старшы інспектар па асаблівых даручэннях галоўнага ўпраўлення Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў Ганна БАНАДЫК.**

Было выяўлена больш як 5 тысяч недахопаў, большая частка з якіх аператыўна ўстараняецца. Балансатрымальнікам выдадзена 333 прадпісанні на выпраўленні выяўленых недахопаў, выканаць якія трэба да 1 верасня.

Акрамя таго, Дзяржаўтаінспекцыяй быў вывучаны стан больш як 1,5 тысячы школьных аўтобусаў. Устаноўлена, што 160 з іх маюць невялікія недахопы, але пры гэтым не выяўлена фактаў эксплуатацыі школьных аўтобусаў без дазволу на допуск да ўдзелу ў дарожным руху. Цяпер дзяцей перавозяць 1508 кіроўцаў. Штоквартальна супрацоўнікі ДАІ праводзяць з імі інструктажы па пытаннях бяспечнай перавозкі дзяцей.

Стрым-семінары з тымі, хто пераступіў закон

Да 1 верасня супрацоўнікі міліцыі абследуюць усе ўстановы агульнай сярэдняй і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, асаблівую ўвагу ўдзяляючы правядзенню прапускнога рэжыму, праверцы наяўнасці і спраўнасці ручных сістэм трывожнай сігналізацыі і відэаназірання.

У новым навучальным годзе МУС плануе праводзіць тэматычныя мерапрыемствы і экскурсіі для школьнікаў. Пра гэта распавёў **намеснік начальніка аддзела арганізацыі работы інспекцыі па справах непаўналетніх управлення прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Васіль ДЗЕМІДОВІЧ.**

Паводле яго слоў, міліцыянеры прымуць удзел у педагагічных канферэнцыях і бацькоўскіх сходах. На іх педагогам і бацькам раскажуць аб асноўных спосабах уцягвання дзяцей у злачынную дзейнасць, новых відах злачынстваў, якія здзяйсняюць дзеці, прыкметах, што ўказваюць на ўдзел дзіцяці ў незаконным абароце наркотыкаў, а таксама сексуальным гвалце ў адносінах да дзіцяці. Нагадаюць і аб медыцынскіх, прававых наступствах такіх дзеянняў.

Сістэма «Маланка» для аператыўнага рэагавання

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях правяло ацэнку стану ўсіх ўстаноў адукацыі да новага навучальнага года. Па словах **першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення нагляду і прафілактыкі — начальніка ўпраўлення арганізацыі нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Васіля СІЎЧАКА,** выяўлена каля 9 тысяч недахопаў па краіне. Ацэньваліся такія моманты, як наяўнасць спраўнай сістэмы пажарнай сігналізацыі, тэхнічных сродкаў супрацьпажарнай абароны, унутранага і вонкавага супрацьпажарнага водазабеспячэння, стан шляхоў эвакуацыі і веданне адміністрацыяй установы адукацыі заканадаўства ў галіне пажарнай бяспекі, а таксама гатоўнасць да дзеянняў пры ўзнікненні надзвычайных сітуацый.

Як распавёў Васіль Сіўчак, не ўсе ўстановы хутка адрэагавалі на выпраўленне недахопаў, а ў дачыненні да 72 кіраўнікоў нават прымаліся меры адміністрацыйнай адказнасці. Таксама ўнесена 13 прадстаўленняў аб устараненні прычын і ўмоў, якія садзейнічалі здзяйсненню правапарушэнняў, што цяпер ліквідаваны.

«У папярэднія гады ў нас былі праблемы з інтэрнатамі. З 2020 да 2022 года ў адносінах да дзевяці выносіліся прапановы аб прыпыненні іх дзейнасці, але ў гэтым годзе такіх пытанняў няма. Дзеці будуць пражываць у бяспечных умовах», — адзначыў Васіль Сіўчак.

«Разам з выканкамамі і Міністэрствам адукацыі мы працуем над павышэннем узроўню супрацьпажарнай абароны. За апошнія пяць гадоў сістэмамі пажарааўтаматыкі абсталявалі амаль 190 аб'ектаў. Таксама вядзецца работа па абсталяванні ўжо існуючай аўтаматыкі сістэмай «Маланка», якая пры надзвычайным здарэнні напрамую перадае сігнал у нашы падраздзяленні для аператыўнага рэагавання. У краіне засталося 89 аб'ектаў, якія ў найбліжэйшы час будуць аснашчаны спецыяльнымі прыборамі».

Уменне дзейнічаць у крызіснай сітуацыі

Важна ствараць псіхалагічна камфортную прастору для навучэнцаў ва ўстановах адукацыі. Такім меркаваннем падзялілася **кансультант упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Наталля ЧААБ.** Паводле яе слоў, адным з аспектаў выхавання культуры бяспекі жыццядзейнасці дзяцей з'яўляецца стварэнне ва ўстановах адукацыі псіхалагічна камфортнага асяроддзя і прасторы даверу для атрымання навучэнцамі ведаў, магчымасці развіцця іх творчых здольнасцяў, прафілактыкі булінгу і суіцыдальных паводзін.

У гэтым навучальным годзе, як і заўсёды, вельмі вялікая ўвага будзе аддадзена тэме ЗЛЖ. Выхаваўчыя мерапрыемствы ва ўстановах адукацыі будуць накіраваны на фарміраванне ў навучэнцаў устойлівага навыку здаровага ладу жыцця, выпрацоўку адмоўных адносін да шкодных звычак, умацаванне фізічнага, псіхічнага і маральнага здароўя.

У сучасных сацыяльных умовах асаблівую актуальнасць набывае фарміраванне ў вучняў уменняў дзейнічаць у крызіснай сітуацыі. «З гэтай мэтай прадоўжыць рэалізацыю факультатыў «Мой псіхалагічны дабрабыт». Асаблівую ўвагу мы ўдзелім навучэнцам, якія прыйдуць ва ўстановы адукацыі першы раз. Шэраг мерапрыемстваў будзе накіраваны на стварэнне максімальна камфортных умоў для іх адаптацыі».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Надвор'е

ПА-ЛЕТНЯМУ ЦЁПЛА

Да плюс 31 градуса і дажджы з навальніцамі абяцаюць сіноптыкі ў Беларусі на бягучым тыдні. Пра гэта паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя.

У сераду, 30 жніўня, ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны абяцаюць кароткачасовыя дажджы. У дзённы час у заходніх раёнах месцамі прагназуюцца моцныя дажджы; у асобных раёнах навальніцы. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. Уначы чакаецца плюс 15—21 градус, днём — плюс 27—34. Па захадзе слупкі падымуцца да плюс 24—26 градусаў.

Згодна з папярэднім прагнозам сіноптыкаў, у чацвер услед за атмасферным фронтам у краіну пачне паступаць умерана цёплая няўстойлівая паветраная маса з Заходняй Еўропы. Таму тэмпературны фон панізіцца: ночы стануць свяжэйшыя, ды і днём ужо будзе не так горача. Толькі па ўсходзе паветра яшчэ паспее прагрэцца да высокіх тэмператур.

У чацвер, 31 жніўня, на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 14 да плюс 20 градусаў. Днём — плюс 20—27 градусаў, а па ўсходзе — плюс 28—31.

У пятніцу, 1 верасня, ноччу месцамі па краіне прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Днём пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па паўднёвым усходзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ноччу дасягне плюс 10—17 градусаў, а днём — плюс 19—26.

У суботу, 2 верасня, будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Уначы тэмпература будзе вагацца ад плюс 8 градусаў па поўначы да плюс 16 па паўднёвым усходзе. Днём паветра прагрэецца да плюс 20—27.

У нядзелю, 3 верасня, ноччу будзе пераважна без ападкаў, раніцай і днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 градусаў па ўсходзе да плюс 16 па захадзе. Днём чакаецца плюс 21—28 градусаў, па поўначы месцамі плюс 19—20.

ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА ПАДРЫХТАВАНЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Школьныя аўтобусы аснашчаны сістэмай відэарэгістрацыі, укамплектаваны вогнетушыцелямі, аптэчкамі, рамянямі бяспекі, сігнальнымі маячкамі, азнаямленчымі знакамі «перавозка вучняў». Прымаюцца меры, накіраваныя на забеспячэнне бесперабойнай перавозкі школьнікаў. У гэтых мэтах 112 аўтобусаў вызначаны ў рэзерв. Яны змогуць выйсці на маршруты ў выпадку паломкі асноўнага школьнага аўтобуса. Прымаюцца меры па абнаўленні парка аўтамабіляў. У адпаведнасці з распараджэннем Прэзідэнта да першага верасня закуплены 151 школьны аўтобус. Да канца гэтага года плануецца пастаўка ва ўстановы адукацыі 124 машын, 87 з якіх з пад'ёмнымі прыладамі для перавозкі вучняў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

«У 2015—2021 гадах праводзілася абнаўленне школьных падручнікаў. Сёння ідзе ўдасканаленне ў працэсе перавыдання. У 2023 годзе запланавана выданне 29 школьных падручнікаў для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. З іх 24 падручнікі выдадзены да першага верасня 2023 года, якія своечасова дастаўляюцца ва ўстановы адукацыі. Астатнія пяць дапаможнікаў будуць выдадзеныя ў верасні-кастрычніку 2023 года. Яны не выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе ў першым паўгоддзі навучальнага года.

«Як і раней, ва ўстановах адукацыі будуць функцыянаваць базавыя і профільныя класы. Профільныя класы маюць сваю прафесійную накіраванасць. Як і ў папярэднія гады, працягваюць функцыянаваць педагагічныя класы прафесійнай накіраванасці, аграрныя, спартыўна-педагагічныя, ваенна-патрыятычныя, а таксама з 1 верасня — інжынерныя і чыгуначныя профільныя класы», — расказала начальнік упраўлення.

Міністэрствам адукацыі зацверджаны адпаведныя навучальныя праграмы. Вучні профільных класаў, акрамя таго, што вывучаюць на павышаным узроўні асобныя навучальныя прадметы, у абавязковым парадку асвойваюць праграму прафесійнай накіраванасці. У дапамогу органам кіравання адукацыі, настаўнікам-прадметнікам распрацаваны інструктыўна-метадычныя лісты. Асаблівая ўвага — выхаваўчаму патэнцыялу ўрока. Ва ўсіх прадметных інструктыўных лістах дадзены рэкамендацыі настаўнікам-прадметнікам, якім чынам выхаваўчы патэнцыял урока асвойваць ці рэалізоўваць на канкрэтным прадмеце, прычым рэкамендацыі дадзены з улікам спецыфікі канкрэтнага ўрока.

«Да гэтага навучальнага года па ініцыятыве Генеральнай пракуратуры Міністэрствам адукацыі выпушчаны вучэбныя дапаможнікі «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны». Гэтыя дапаможнікі падрыхтаваны з улікам узроставых асаблівасцяў вучняў. Дапаможнікі зроблены асобна для 1—4 класаў, 5—9 класаў і 10—11 класаў. Да пачатку гэтага навучальнага года ўпершыню падрыхтаваны інструктыўны ліст аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у якім выкладзены вынікі расследавання крымінальнай справы Генеральнай пракуратурай», — акцэнтавала Ірына Каржова.

Яна паведаміла, што ў наступным навучальным годзе Міністэрствам адукацыі будзе прадоўжана работа па правядзенні маніторынгу якасці адукацыі. У лістападзе 2023 года запланавана правядзенне Нацыянальнага даследавання якасці адукацыі. У даследаванні прымуць удзел вучні 10 класаў. Статыстычную выбарку правядуць выпадковым чынам. Даследаванне ўключае выкананне дыягнастычнай работы, анкетаванне навучэнцаў і педагагічных работнікаў. Дыягнастычная работа будзе накіравана на праверку здольнасцяў падлеткаў выкарыстоўваць атрыманы на вучэбных занятках вопыт асваення ведаў, уменняў, спосабаў дзейнасці для вырашэння жыццёвых праблем, дасягнення пастаўленых мэт. На нацыянальным адукацыйным партале размешчаны рэкамендацыі па правядзенні нацыянальнага даследавання якасці адукацыі.

У 2023/2024 годзе будзе захавана практыка правядзення рэспубліканскіх кантрольных работ. Сёлета ўпершыню Міністэрствам адукацыі запланавана правядзенне рэспубліканскай кантрольнай работы для вучняў 11 класаў па гісторыі Беларусі.

Ірына Каржова адзначыла, што да пачатку навучальнага года ва ўстановы адукацыі размеркавана 5,5 тысячы маладых спецыялістаў. Паводле інфармацыі органаў кіравання на месцах, установы адукацыі да пачатку верасня будуць укамплектаваныя педагагічнымі кадрамі ў поўным аб'ёме.

Амаль пяць тысяч аб'ектаў сістэмы адукацыі з пачатку года прайшло кантроль органаў дзяржаўнага пажарнага нагляду, паведаміў журналістам **начальнік Галоўнага ўпраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Дзмітрый ТУРЧЫН.**

«Гэта ў тым ліку інтэрнаты пры вышэйшых, сярэдніх спецыяльных установах, у якіх будуць пражываць студэнты», — сказаў Дзмітрый Турчын.

Ён падкрэсліў, што кантрольна-наглядныя мерапрыемствы органамі дзяржаўнага пажарнага нагляду праводзяцца на працягу ўсяго года.

Як падкрэсліў начальнік Галоўнага ўпраўлення МНС, шэраг парушэнняў ліквідуецца ў перыяд правядзення наглядных мерапрыемстваў. Тыя парушэнні, якія патрабуюць пэўнага часу для ліквідацыі, абмяркоўваюцца з кіраўніком установы, фіксуюцца ў адпаведных актах рэагавання і ліквідуюцца, як правіла, ва ўстаноўленыя тэрміны.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,

ЛЕЦІШЧА — МЕСЦА АДПАЧЫНКУ І ПРЫЕМНЫХ ЗНОСІН

Што рабіць, каб было менавіта так, і аб навацыях у сферы дачнага заканадаўства пагаварылі з вопытным кіраўніком садовага таварыства

Садаводчае таварыства «Сябры-2002» называюць знакамітым, што нядзіўна. З 1983 года тут размяшчаюцца лецішчы эліты беларускага мастацтва. У коле мінчан, чые дачы размешчаны ў Лагойскім раёне, аб гэтым СТ гавораць як аб узорным, што ўжо заслуга праўлення. Старшыня яго Юрый ГАЛАШЧАПАЎ пагадзіўся падзяліцца сваім трынаццацігадовым вопытам, з ім жа мы пагаварылі аб рэзанансных «дачных» указах і іх практычным прымяненні.

— Раскажыце, колькі ў СТ участкаў, ці шмат дачнікаў жывуць пастаянна, якая інфраструктура.

— У нас 400 участкаў, 60 сем'яў, у тым ліку мая, жывуць цэлы год. З самага пачатку ў нас быў запраектаваны ўсесезонны водаправод, стацыянарная тэлефонная сувязь. Цяпер СТ часткова газіфікавана, ёсць оптавалакновы інтэрнэт. У летні сезон працуе невялікая прыватная крама, у выхадныя — два аб'екты выязнога гандлю. Натуральна, ёсць дзіцячая пляцоўка, а таксама футбольнае поле, тэнісны корт, валейбольная пляцоўка, свой пляж. Існуе ж, мне дасталася добрая спадчына: у нашым СТ былі вольныя ад забудовы плошчы, таму мы змаглі стварыць інфраструктуру для вольнага часу.

— У вас вельмі цікавая сістэма аплаты членскіх узносаў: вызначана сума за год — 333 рублі, а плаціць можна як зручна: хочаш адразу, хочаш кожны месяц. Чаму?

— Так склалася, і пакуль гэтая традыцыя захоўваецца. У нас шмат артыстаў, за савецкім часам, калі яны атрымалі дачныя ўчасткі, гастролі доўжыліся месяцамі. Таму камусьці зручна было плаціць адразу за год. І зараз ёсць людзі, якім так зручна. А вось некаторым пажылым дачнікам падабаецца плаціць кожны месяц. Для многіх гэта рытуал: прыйсці ў праўленне, аплаціць узнос, абмяняцца навінамі.

— Няўжо ў наш час прымаюць узносы наяўнымі?

— Заканадаўства гэта дазваляе. Для людзей так больш звыкла і камфортна, таму, пакуль ёсць ахвотныя, казначэй будзе прымаць узносы і такім чынам.

— Вы ж ведаеце, што ў мяне тут шмат знаёмых дачнікаў, дык вось яны адзначалі, што «наш старшыня навёў парадак з вывазам смецця». Думаю, ваш досвед будзе цікавы шмат каму.

— Гэта сапраўды была адна з вострых тэм. Яшчэ калі не быў старшынёй, разам з прыяцелямі-энтузіястамі стараўся хоць неяк акультурыць месца звалкі смецця. Калі абралі старшынёй, перш за ўсё сабраў прапановы ўсіх аператараў па вывазе смецця. На праўленні абралі аптымальны варыянт па суадносінах кошт — паслугі. Уладкавалі тры пляцоўкі, на якіх стаяць кантэйнеры для ТБА і для габарытнага смецця. Магчыма, вы здзівіцеся, але грувасткае смецце вывозяць практычна кожны тыдзень. Людзі рэканструюць дамы, мяняюць мэблю — прычэп запаўняецца хутка. Вываз смецця — самы вялікі артыкул выдаткаў, за год мы трацім 30 тысяч рублёў. Але людзі не пярэчаць, таму што стала чыста, ніхто не спальвае старую мэблю і не труціць паветра.

— Акрамя крамы на ўездзе ў СТ, бачу і гандлёвую палатку... Як вы з імі ўзаемадзейнічаеце?

— Крама належыць прыватнай фірме. Яна патрэбна, бо па кожную дробязь нават у Астрашыцкі Гарадок выязджаць нязручна. Што да палаткі і выязнога гандлю, то ўсё проста: мы цікавімся наяўнасцю усіх дазвольных дакументаў на гандаль, бязвыплатна даём месца. Палатка працуе па выхадных. Напоі, сасіскі ў цесце, бургеры — усё гэта карыстаецца попытам, на свежым паветры ў дзяцей добры апетыт. Перакананы, што дачны гандаль трэба развіваць: у людзей з'яўляецца выбар, у прадаўцоў — здаровая канкурэнцыя.

— Атрымала велізарнае задавальненне ад прагулкі па ўсім СТ, убачыла такія чароўныя рэтра-домікі, пабудаваныя яшчэ па савецкіх стандартах, калі іх плошча, вышыня былі моцна рэгламентаваны. Мне здалося, што многія з іх усё-ткі незаселеныя, але ў той жа час участкі дагледжаныя: сумнік не расце, дрэвы абразаюцца. Як вам удаецца дабіцца такога выніку?

— Так, ёсць некалькі падобных домікаў. Гаспадары, а часцей за ўсё гаспадыні, гавораць, што ў іх ужо няма магчымасці ездзіць, даглядаць участак. Але і прадаць яны не могуць, таму што для іх лецішча — гэта памяць. Паколькі яны плацяць узносы, то павінны атрымліваць нейкія паслугі ад СТ. Вось мы і сочым, каб не было інвазійных раслін, каб галіны дрэў не датыкаліся да правадоў ліній электрапередач і не навісалі над дарогай.

— Але як вы знаходзіце гаспадароў? Часам гэта неверагодны квэст...

— Вельмі проста. Кожны год праўленне дасылае запыт у агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры і атрымлівае звесткі аб усіх уладальніках участкаў. Цяпер гэта платная паслуга, а калі набудзе моц Указ № 155, раз на год такія звесткі будуць даваць бясплатна. Гэта вельмі важна, таму што, па правілах, новы ўласнік павінен прадставіць праўленню шэраг звестак, на практыцы мы часам і не ведаем, што хтосьці прадаў свой участак. Такія «невідзімкі» могуць і ўзносы не плаціць, і за ўсё астатняе не разлічваецца, што, вядома ж, не на карысць СТ. Дарэчы, за год у нас мяняюцца гаспадары 6—10 участкаў.

— Калі СТ было газіфікавана і наколькі гэта цяжка і дорага? Ведаю, што ў шматлікіх СТ гадамі «хочуць газ», але не могуць прыйсці да нейкага агульнага рашэння. Мая прыцелька думае прадаць лецішча, таму што ёй не патрэбен газ, а суседзі за гэта падвяргаюць яе прэсінгу, маўляў, нельга праклясці газаправод, абыходзячы нечы ўчастак.

— Восем гадоў таму мы склалі спіс ахвотных. Аказалася дастатковая колькасць для таго, каб перайсці да практычных крокаў. У нас газіфікавана крыху больш за палову ўчасткаў. Пры тым, што нам не трэба было весці лінію газаправода ў некалькі кіламетраў, бо побач з СТ пансіянат, справа гэта не з танных. Да таго ж дом павінен адпавядаць вызначаным патрабаванням для ўстаноўкі газавага абсталявання. Увогуле, кожны сам вырашае, зыходзячы са сваіх фінансавых магчымасцяў і жыццёвых планаў. Але запраектавалі такую магутнасць, што пры жаданні змогуць падключыцца ўсе нашы ўчасткі.

— Інтэрнэт, ведаю, у вас даўно, той, які прывязаны да тэлефоннай лініі. А цяпер і оптавалакно з'явілася. Як вы гэта арганізавалі?

— Дачнікі пыталіся аб оптавалакновым інтэрнэце. У такіх выпадках мы запрашаем на сход спецыялістаў, каб яны самі расказвалі пра перавагу тэхналогіі, а людзі маглі задаваць пытанні. Мы выбралі «Белтэлекам», бо спадабаліся тарыфы і для многіх важная магчымасць калі не бясплатнай, то вельмі таннай блакіроўкі на зімовы перыяд. Палова дачнікаў выбралі оптавалакно, яшчэ 50 абанентаў па праекце ёсць у рэзерве. Ну і, акрамя таго, у нас Wi-Fi каля вартоўні і праўлення, камусьці і такога варыянта дастатковa.

Важна вось што яшчэ. Пачынаць трэба не з оптавалакна, а з усесезоннага водаправода. Усе камунікацыі ў адной траншэі: на самай вялікай глыбіні водаправод, затым на пэўнай дыстанцыі газ, і толькі потым — оптавалакно. Калі пракласці спачатку газ, то газавікі не дазволяць паглыбляць траншэю пад ваду. Раскапаўшы траншэю з оптавалакном, рыхтуйцеся яго замяніць, бо яно вельмі далікатнае.

— Дзіцячая і спартыўныя пляцоўкі, пляж, кажуць, — цалкам ваша заслуга. Як гэта ўдалося зрабіць, бо той жа тэнісны корт — дарагое задавальненне?

— Самая добрая ідэя праўлення нічога не вартая без падтрымкі дачнікаў. Дзіцячую пляцоўку я сам прапанаваў, бо цудоўна ведаю, што дзеці не любяць ездзіць на лецішча, калі ім даводзіцца бавіць час на сваім участку. Многія мяне падтрымалі і на ўладкаванне дзіцячай пляцоўкі здавалі дораахвотныя ўзносы. Тут жа ў нас ёсць вялікая альтанка, дзе любяць збірацца падлеткі. Спартыўныя пляцоўкі падтрымала недзе працэнтаў 90 дачнікаў. І заняткі ідуць па раскладзе. Нашы дачнікі гатовы плаціць, калі яны бачаць вынік.

Што датычыцца пляжа, то на ім у нас пірс, альтанка, раздзявальні, душ, вогнішча, лаўкі. Дачнікі выходзілі на суботнікі, каб добраўпарадкаваць тэрыторыю, таму яна ў ідэальным стане.

Перакананы, што лецішча — гэта перш за ўсё месца адпачынку, прыемных зносін. І ўся наша інфраструктура гэтаму садзейнічае. Людзі знаёмяцца, сябруюць, усё гэта стварае камфортную атмасферу.

— Ці захавалася традыцыя ладзіць канцэрты перад адкрыццём сезона і закрыццём?

— Мы яе адрадзілі, потым з-за коўіду была паўза, сёлета плануем канцэрт да закрыцця сезона. Дарэчы, ковід прымусіў нас праводзіць агульныя сходы ў завочнай форме, і гэта вельмі добры досвед. Заўсёды ёсць кворум, ёсць дакумент, які пацвярджае, як чалавек галасаваў.

— Якія навацыі з Указа № 155 аб садаводчых таварыствах больш за ўсё вас парадавалі?

— Перш за ўсё, перадача электрасетак на баланс дзяржавы. Праўленням СТ гэта значна аблегчыць жыццё, самі дачнікі таксама станоўча ўспрымаюць навіну. У той жа час цудоўна разумею, што нам да гэтага трэба сур'ёзна рыхтавацца. У нашым СТ не было прымусу выносіць лічыльнікі за межы дома, цяпер зрабіць гэта давядзецца ўсім. Плюс у тым, што вядомыя параметры лічыльнікаў, на якія трэба замяніць старыя.

Падтрымліваю тое, што ўзмоцніцца роля мясцовых органаў улады ў жыцці СТ, маю на ўвазе прызначэнне старшыняў па рашэнні выканкама. Зразумела, што гэта датычыцца праблемных СТ, якія перастануць быць, скажам так, безгаспадарнымі. Часцей за ўсё некалькі СТ размяшчаецца побач, і заўсёды прыемна, калі ў цябе паспяховы сусед.

Выдатная навацыя, якая датычыцца галоснасці ў СТ. Мы і раней прытрымліваліся гэтага прынцыпу: калі людзі ўсебакова праінфармаваныя, рэальных падстаў для нейкіх канфліктаў, як правіла, няма.

— Ці абмяркоўваецца ў вас перспектыва атрымання СТ статусу населенага пункта?

— З вялікім энтузіязмам. Чалавек перш за ўсё бачыць усё добрае, што дае навацыя, найперш — паніжэнне тарыфаў. Праўленне ж пачынае тлумачальную работу, што да такіх перамен трэба рыхтавацца, нейкія намаганні спатрэбяцца ад кожнага. Самы просты прыклад: выдаліць дэкаратыўныя хмызнякі, якія растуць перад плотам участкаў, каб пашырыць дарогу.

— Юрый, падзяліцеся, калі ласка, найбліжэйшымі планамі.

— Хачу стварыць клуб-музей. Тут жылі і яшчэ жывуць зоркі беларускага мастацтва і спорту. Плануем як мінімум размясціць іх партрэты і творчыя біяграфіі. Вы ж ведаеце, што месца ў нас тут цікавае, некалі гэта зямля належала графскаму роду Тышкевічаў. Легенда гаворыць, што менавіта ў Астрашыцкім Гарадку Янка Купала напісаў сваю знакамітую паэму «Курган». Сам захапляюся гісторыяй і спадзяюся захапіць суседзяў. Цяпер, гуляючы па беразе ракі Усяжа, гледзячы на старыя дубы, думаю: магчыма, іх бачыў Янка Купала. Уявіце, што праз нейкія гадоў пяцьдзясят, сюды хто-небудзь прыйдзе і падумае: ого, на беразе гэтай рэчкі адпачывалі Віктар Вуячыч, Леанід Шчамялёў, Барыс Аракчэеў, Эдуард Малафееў, Людміла Бржазоўская, Віктар Саркісьян і Вольга Лапо, Уладзіслаў Місевіч, Алена Спірыдовіч і многія іншыя, дзякуючы чыёй творчасці або дасягненням у спорце, свет даведаўся пра Беларусь.

Маргарыта ДРАЗДОВА, фота аўтара.

Нагода для гонару

ПРАЦА ЯК ФОРМУЛА ІСНАВАННЯ

Пра жыццёвую філасофію гродзенкі Галіны Гулінскай, якая ўдастоена медаля «За працоўныя заслугі»

Урачыстая цырымонія ўзнагароджвання адбудзецца пазней. Але віншаванні Галіна Гулінская ўжо прымае — навіна хутка абляцела Гродзенскую агароднінную фабрыку, дзе яна працуе не адно дзесяцігоддзе. Для яе самой такое высокае ўшанаванне стала прыемным сюрпрызам, хоць з года ў год Гулінская ў ліку лідараў свайго прадпрыемства.

ЭКАЛАГІЧНЫЯ ТАМАТЫ

Галіна Анатольеўна сустракае мяне каля свайго 3-га ўчастка і вядзе на працоўнае месца. Па тым, як вітаюцца з ёй калегі, зразумела: яна не толькі паважаны, але і сяброўскі чалавек. Падчас размовы жанчына не хавае эмоцый, шчыра расказвае пра сваю працу, сям'ю, раскрывае сваю жыццёвую філасофію. А яна, гэта філасофія, аказалася надзвычай простай. Яе сэнс — у працы.

Здаецца, што тут асаблівага? На гэту формулу скіраваны многія, але ў лёсе маёй суразмоўніцы ёсць адметны акцэнт — вернасць сваёй справе. Яна 35 гадоў працуе агароднікам на фабрыцы. Напачатку на агурковым участку, потым — на таматным. Сюды і прыйшлі мы падчас размовы.

Гродзенская агароднінная фабрыка — бадай самая вялікая цяплічная гаспадарка рэгіёна. Гадоў 13 таму тут адбылося аднаўленне, пабудаваны новыя энергаэканомныя цяпліцы, штогод вядуцца эксперыменты па вырошчванні новых сартоў. Сёлета эксперымент закрануў і таматны ўчастак. Наколькі ён сябе апраўдаў, пакажа канчатковы збор ураджаю, які завершыцца на пачатку лістапада. У мінулым годзе Галіна Гулінская са свайго ўчастка здала больш за 60 тон таматаў.

— Мы хочам атрымаць добры ўраджай, адправіць як мага больш агародніны спажыўцам, — кажа суразмоўніца, — і хачу запэўніць, што наша прадукцыя экалагічная, можа, нават чысцейшая, чым у агародзе. Чаму? Таму што ў зямлі ідзе назапашванне розных шкодных рэчываў, а тут грунт кожны год мяняецца, ён чысты, угнаенняў амаль няма, таму мы самі не баімся даваць і дзецям, і ўнукам сваім нашу агародніну. Магчыма, смак у цяплічнай прадукцыі не такі, як з агарода, затое яна экалагічна чыстая. Нашы памідоры ідуць як на знешні рынак, так і за мяжу, па большай частцы ў Расію.

Для апрацоўкі раслін закупляюцца спецыяльныя насякомыя, якія паядаюць шкоднікаў — белакрылку, кляшча. Гэта робіцца для таго, каб лішні раз не апрацоўваць расліны. Для лепшай завязкі іх апыляюць чмялі, якія жывуць у спецыяльных каробках і раз-пораз вылятаюць «на працу». Калі памідор не апыліць, не будзе добрай завязі.

ПРАЦОЎНЫ СТАЖ — ФАБРЫЧНЫ

Доўгім тэрмінам на адным месцы могуць пахваліцца далёка не ўсе працаголікі. Галіна Гулінская — з тых, хто ўсё жыццё звязаў з адным прадпрыемствам.

— Я прыйшла сюды адразу пасля другога дэкрэтнага адпачынку, мне тады было 25 гадоў. Гэта быў канец 80-х. Выбрала гэту працу па дзвюх прычынах — добрая зарплата і любоў да раслін. Памятаю, што за першую 13-ю зарплату купіла спальню «Медуніца». Гэта была папулярная даволі марка, — успамінае жанчына.

Але галоўную ролю ўсё ж адыграла яе любоў да раслін. «Гэта мая стыхія, — кажа яна. — Мой свет, дзе я адчуваю сябе на сваім месцы».

— А як жа меркаванні псіхолагаў, якія кажуць, што трэба мяняць від дзейнасці кожныя 6-7 гадоў? — пытаюся ў яе.

—- Вы любіце працаваць з раслінамі? — рэагуе на пытанне Галіна Анатольеўна. — А я люблю. І гэта ў мяне нядрэнна атрымліваецца.

Але і ў дадзенай справе ў яе ёсць свае перавагі. Напрыклад, больш падабаецца працаваць з таматамі, чым з агуркамі. Усе тонкасці ведае дасканала. З нормамі сваімі спраўляецца, хоць за час работы яны выраслі больш чым удвая. Гэта сведчыць аб тым, што павялічыліся аб'ёмы вытворчасці, адпаведна і большым стаў ураджай.

Раз-пораз усё ж звяртаю ўвагу на такі працяглы стаж работы. Так ці інакш імкнуся прымераць на сябе гэту сітуацыю, але ўласці такі факт у свядомасць ніяк не атрымліваецца. Надта манатоннай падаецца гэта работа на першы погляд. Галіна Анатольеўна імкнецца развеяць гэта ўражанне.

Па яе словах, работа не такая і манатонная. Жанчына, як і іншыя агароднікі, вядзе ўвесь працэс росту плантацыі — ад пасадкі да збору ўраджаю. На кожнага — па 11 сотак.

Прыемна бачыць, як з'яўляюцца плады, растуць. Праўда, для гэтага трэба прыкласці нямала намаганняў. Тут і абрэзка, і падвязка. Асабліва адказнасць пачынаецца падчас збору ўраджаю. А тут яшчэ ў спёку шкляныя аб'екты моцна прагравацца. Каб аблегчыць працу, кіраўніцтвам прадпрыемства зменены графік работы — з 6 гадзін раніцы да 2-3 гадзін дня.

Збор ураджаю вядзецца на спецыяльных электрапад'ёмніках. Яны падымаюць ажно да столі цяпліцы і рухаюцца па калейцы. Выбіраюць памідоры праз дзень. У іншыя дні вядзецца падрыхтоўка плантацый. У змену Галіна Гулінская збірае 1,2 тоны таматаў.

— Калі з раслінамі працуеш, хочацца, каб быў ураджай, — прызнаецца суразмоўніца. — У гэтым плане таксама ёсць канкурэнцыя. Але ў асноўным адносіны з усімі роўныя, кожны заняты сваёй справай. Для настрою музыку ўключыў — і працуеш. Хачу сказаць, што цяпер навічкам вельмі дапамагаюць, а калісьці проста прыйшлі, паказалі ўчастак — і разбірайся тут. Тады была на агурках на плёначных цяпліцах. Потым перайшла на гэтыя, больш сучасныя.

«ШТОСЬЦІ ТРЫМАЕ МЯНЕ ТУТ»

Сёлета Галіна Анатольеўна адзначыла 60-гадовы юбілей. Кажа, што за ўсё жыццё не была ні ў санаторыі, ні на моры. Свае працоўныя адпачынкі праводзіць на вясковых сотках альбо ў хатніх клопатах.

— У мяне мама адна была, я бачыла, як яна стараецца ўсюды паспець. Даяркай працавала ў Брэсцкай вобласці. Я і сваіх дзяцей прывучала да працы. Яны сталі дапамагаць з дзяцінства, калі іх бабуля жыла. Прыязджалі палоць буракі. Увесь час потым жартавалі, што ў іх адпачынак летні быў на полі. Але добра, што прывыклі да працы. Сын і цяпер дапамагае вельмі, ніякай работы не баіцца. І ў вёску прыязджае, і на дачу, — дзеліцца суразмоўніца.

Вясковы ўчастак у Гулінскіх не сказаць што малы. Цэлых 50 сотак зямлі, дзе вырошчваюць бульбу, ягады, гародніну. Ёсць і хатняя жыўнасць — свінні, куры, трусы, авечкі. За гаспадаркай сочыць муж Галіны Анатольеўны. А вось кветнік — толькі яе справа. Жанчына, як і дзеці, прыязджае ў вёску па выхадных. Кажа, што жыццё там цяпер адраджаецца. Усе дамы выкуплены, ніводзін не пустуе.

— Працы хапае. Але яна мне знаёмая, гэта як звычка. Хаця дзеці і ўнукі мне раяць ужо ісці на адпачынак. Кажуць: хопіць працаваць. І муж іх падтрымлівае. Тым больш што працаваць трэба і на сваіх сотках. Але пакуль нешта трымае мяне тут, на фабрыцы, — кажа жанчына.

Такім чынам, гаворка зноў скіроўваецца на вытворчасць. Па словах Гулінскай, ёй трэба сабраць яшчэ каля 20 тон таматаў да тых 40 тон, што ўжо ёсць. Пытаюся, ці ёсць запас сіл для гэтага?

— Цяпер мне 60, і адчуваю, што стала цяжэй. Здаецца, рукі не такія спрытныя, як раней, таму трэба быць больш уважлівай. Але ў мяне яшчэ такі характар — імкнуся зрабіць як мага лепш, гэта для мяне важна. Што запланавана, павінна быць выканана. Каб і расліны былі дагледжаны, і ўсе патрэбныя маніпуляцыі праведзены, і ўраджай сабраны. Інакш не змагу ні спаць, ні есці. І дома так павінна быць — поўны парадак.

Вось такое жыццё ў нашай гераіні, якая ўзнагароджана медалём «За працоўныя заслугі». Урачыстая цырымонія ўручэння ўзнагароды стане ў шэрагу самых важных падзей яе лёсу. Галіна Анатольеўна ўжо рыхтуецца: плануе купіць новы касцюм, абутак, зрабіць прычоску і манікюр. Вельмі прыемна, калі ёсць яшчэ адна падстава адчуць сябе прыгожай жанчынай.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

Хутка ў школу

Сабраць адно дзіця — да тысячы рублёў

Самыя дарагія старшакласнікі Міншчыны і старшакласніцы Віцебшчыны

Такія падлікі зрабілі спецыялісты Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ), якія праманіторылі кошт школьных тавараў у гандлёвых цэнтрах, універмагах, кірмашах краіны. Пры гэтым эксперты сведчаць, што па асобных групах тавараў кошт зменшыўся. У параўнанні з мінулым годам сёлета крыху патанеў шэраг пазіцый канцылярскіх прылад, а таксама некаторыя віды адзення і абутку. А цэнавыя надбаўкі на многія віды адзення і абутку абмежаваны «столлю» ад 35 % да 55 %.

АДЗЕЦЬ І АБУЦЬ ПАЧАТКОЎЦАЎ...

Пры гэтым цана на адзін і той жа тавар у розных рэгіёнах можа моцна адрознівацца, падзяліліся ў прэс-службе ФПБ:

— Як і летась, менш за ўсіх на абутак і адзенне патрацяць сем'і хлопчыкаў пачатковай школы на Гродзеншчыне — 527,06 рубля. У 2022-м сярэдні чэк для гэтай катэгорыі вучняў быў яшчэ больш дэмакратычным — 479,87 рубля. Самыя дарагія пачаткоўцы-хлопчыкі, як і летась, на Міншчыне — сёлета іх адзенне-абутак абыдзецца ў 682,01 рубля.

Для дзяўчынкі малодшага школьнага ўзросту адзежа-абутак танней за ўсё ў Віцебскай вобласці — 457,23 рубля. Летась, дарэчы, самым бюджэтным для гэтай катэгорыі вучняў быў Гродзенскі рэгіён. Даражэй за ўсё абуць і апрануць дзяўчынак-пачаткоўак у Магілёўскай вобласці — 701,22 рубля.

...І СТАРШАКЛАСНІКАЎ

Больш за ўсіх сярэдні чэк на абутак і адзенне для старшакласніка-хлопчыка падрос у Мінскай вобласці — да 761,76 рубля. Летась сталічны рэгіён таксама быў самым дарагім. Найбольш танна абыдуцца хлопцы старэйшай школы бацькам з Гродзеншчыны — 660,69 рубля. Летась гэты рэгіён таксама быў самым дэмакратычным, аднак каштаваў пры гэтым больш — 680,63 рубля.

Найбольш сціплы цэннік на адзежу і абутак для старшакласніц у Гродзенскай вобласці — 694,03 рубля, прычым найніжэйшая планка для гэтай катэгорыі трымаецца ўжо трэці год запар. А вось Магілёўская вобласць другі год трымае званне самай дарагой для дзяўчат старшых класаў — 797,9 рубля.

«КАНЦЫЛЯРКА»

Затое ў Магілёўскай вобласці найтаннейшыя канцылярскія тавары для малодшых школьнікаў — 155,09 рубля, самая дарагая «канцылярка» на Брэсцчыне — 188,58 рубля. Летась самымі невялікімі лічбамі ў гэтым сегменце вызначалася Гомельшчына (174,86 рубля), а самымі дарагімі — Віцебшчына (207,81 рубля).

Найбольш танны канцылярскі камплект для старшакласніка сёлета таксама на Магілёўшчыне — 123,58 рубля, а самы дарагі — на Віцебшчыне — 212,84 рубля. Летась пальму «канцылярскага першынства» трымаў Мінск — 230,26 рубля, а самыя танныя прылады былі на Гомельшчыне — 161,11 рубля.

— Калі абагуліць падлікі, то відаць, што танней за ўсё закупіцца да 1 верасня (абуткам, адзеннем і «канцыляркай») могуць бацькі хлопчыкаў малодшай школы ў Гродзенскай вобласці — 710,56 рубля, і маленькіх вучаніц Віцебшчыны — 637,21 рубля. Найдаражэйшыя за іншых будуць зборы ў школу пачаткоўцаў Мінскай вобласці (859,99 рубля) і пачатковак Магілёўскай вобласці (856,31 рубля), — падсумавалі ў ФПБ.

Больш за іншых схуднеюць кішэні ў бацькоў, якія рыхтуюць у школу старшакласнікаў. Найбольш танную перавагу ў гэтым пытанні маюць бацькі хлопцаў старэйшых класаў у Магілёўскай вобласці (816,58 рубля) і бацькі дзяўчат — Гродзенскай (860,71 рубля). Самымі дарагімі сёлета прызнаныя старшакласнікі Міншчыны (834,81 рубля) і старшакласніцы Віцебшчыны (959,37 рубля).

У ФПБ нагадалі, што летась многія пастаўшчыкі і шэраг гандлёвых арганізацый пачалі граць на курсавай розніцы і тлумачылі завышаныя цэны магчымымі рызыкамі. Пастанова Урада № 713 спыніла гэтыя працэсы і ўвяла абмежаванні гадлёвых надбавак на тавары, у тым ліку імпартныя. Рэальная надбаўка ў крамах зараз не перавышае 29 %.

Ірына СІДАРОК.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов по продаже имущества ОАО «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ» в форме открытого аукциона

№ Лота	Наименование предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб. (10 %)	Шаг аукциона, бел. руб. (5 %)
1	Вибратор, инв. 146	27,00	2,70	1,35
2	Генератор сварочный EP200X-XC-200АД (только двигатель), инв. 434	156,60	15,66	7,83
3	Дрель ударная GSB 19-2 RE (н/раб.), инв. 756	18,00	1,80	0,90
4	Компьютер CDL с монитором «Самсунг», клавиатура системник (н/раб.), инв. 708	14,94	1,49	0,75
5	Компьютер монитор «Самсунг» 795, инв. 436	7,74	0,77	0,39
6	Компьютер, инв. 525	9,54	0,95	0,48
7	Нивелир НИ-3 (н/раб), инв. 419	32,40	3,24	1,62
8	Нивелир НИ-3 (н/раб), инв. 606	15,84	1,58	0,79
9	Нивелир (н/раб), инв. 597	15,84	1,58	0,79
10	Нивелир (н/раб), инв. 60048-а	17,82	1,78	0,89
11	Ноутбук 15,6 «Самсунг» 305E5Z РФ, инв. 761	36,00	3,60	1,80
12	Ноутбук 15,6 «Самсунг» 305E5Z серебр. РФ, инв. 746	36,00	3,60	1,80
13	Опалубка монолитных стен конте РФ, инв. 782: 1. щит 3000*1200 мм (49 шт.); 2. щит 3000*1100 мм (1 шт.); 3. щит 3000*1000 мм (3 шт.); 4. щит 3000*900 мм (1 шт.); 5. щит 3000*800 мм (2 шт.); 6. щит угловой (4 шт.); 7. анкер торцевой (4 шт.); 8. болт стяжной SAS15FC (96 шт.); 9. гайка стяжная оц 90 мм (190 шт.); 10 замок клиновый (75 шт.); 11. замок универс. оц (55 шт.); 12. захват крановый «Гамма» (2 шт.); 13. кронштейн подмостей (25 шт.)	1257,93	125,79	62,90
14	Перфоратор GBH 4-32 DFR Герм (н/раб), инв. 777	66,60	6,66	3,33
15	Перфоратор SDS plus GBH 4-32 Герм (н/раб), инв. 728	43,20	4,32	2,16
16	Перфоратор SDS plus Bosch GBH 2-28 DFV Герм (н/раб), инв. 753	18,00	1,80	0,90
17	Подъемник к-1, инв. 140	99,00	9,90	4,95
18	Подъемник к-1, инв. 302	99,00	9,90	4,95
19	Полуавтомат МИДИ Макстер 1800, инв. 501	90,00	9,00	4,50
20	Пуско-зарядное устройство 24-12 Вт, инв. 638	36,00	3,60	1,80
21	ПЭВМ «Сильверадо» (мышь, монит.19, клав) без сист. комплект, инв. 500	7,02	0,70	0,35
22	Смеситель EM1-950K (н/раб), инв. 629	19,80	1,98	0,99
23	Телефакс, инв. 98	2,16	0,22	0,11
24	Теодолит ЗТ5КП (н/раб), инв. 794	91,80	9,18	4,59
25	Транспортер, инв. 407	136,80	13,68	6,84
26	Шлагбаум ASB600, Китай, инв. 760	75,60	7,56	3,78
27	Экскаватор ЭО-26-21 (на запчасти)	1350,00	135,00	67,50
28	Станок фуговальный, инв. № 37883	92,40	9,24	4,62
29	Станок лесопильный, инв. № 37881	79,20	7,92	3,96
30	Имущество согласно списку № 1: https://docs.google.com/document/d/10hhmUCHJEaF-grL8W6ro54bLs4rESFdz/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	291,33	29,13	14,57
31	Имущество согласно списку № 2: https://docs.google.com/document/d/1TZ6DIdAX3VN93T4FOyH4T1ciBpVu-C0G/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	1029,37	102,94	51,47
32	1. Гигром. психометр (госповерка); 2. Гигрометр (РФ) д/измер. влажн. стр. мат.Testo 606-1; 3. Гигрометр психометрический ВИТ-1(госповерка); 4. Измеритель влажн. матер.	259,20	25,92	12,96
33	1. Дорожные плиты, 4 шт.; 2. 3ПБ 16-37п; 3. КЦ 10-6; 4. ПК 24.12.4; 5. ПК 27.12.8; 6. ПТМ72.15.22-8,0 S800-2а (плиты пустотного настила), 2 шт.; 7. ПТМ75.12.22-8,0 S800 3а	1022,40	102,24	51,12
34	Имущество согласно списку № 3: https://docs.google.com/document/d/1pcqR_6xO9lUEAzuaZs2ftBj5O3OOJ2h1/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	464,40	46,44	23,22
35	1. Дальномер лазерный GLM 80 BOSCH (рулетка эл.); 2. Эл. уровень	235,80	23,58	11,79
36	1. Шпилька 12*2000рез. Штанга, 0.003 т.шт.; 2. Шпилька резьбовая 16*2000, цинк, 0.036 т.шт.; 3. Шпилька резьбовая цинк 6*2000,0.002 т.шт.; 4. Шпилька резьбовая цинк 8*1000,0.002 т.шт.	240,30	24,03	12,02
37	1. Домкрат 111-3913010 (25 тонн); 2. Домкрат 12-3913010	1017,90	101,79	50,90
38	1. Каска защ. COM3-55, 3 шт.; 2. Каска защитная Б. б/у; 3. Каска-бейсболка «Каскетка» цв. син., 2 шт.; 4. Халат жен. «Гренада»; 5. Кепи-бейсболка	27,90	2,79	1,40
39	Имущество согласно списку № 4: https://docs.google.com/document/d/14qYa5M3qlYWZZZqThxOXUSnGxrLUvh4B/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	448,56	44,86	22,43
40	1. Миксер-дрель МД1-11Э (1100 Вт) без насадки Фиолент; 2. Шнур каменщика 30 м (госповерка); 3. Штангенциркуль ШЦ-II-250 (0,05) (госповерка); 4. Кельма из нерж. стали 160 мм; 5. Емкость строит. круглая 45 л; 6. Шлифшкурка на бум. основе (рулон 115 мм*50 м), 22 м.п.; 7. Тачка строит. ТС-2; 8. Ножницы по металлу 260 мм прямые; 9. Ножовка для газобетона 630 мм, 34 тверд., 2 шт.; 10. Молоток-кирка 0,7 кг, дер. ручка	278,10	27,81	13,91
41	1. Перчатки диэлектр. бесшовные, 2 пары; 2. Розетка 1-гнезд. с/заз; 3. BYLECTRICA откр. уст. белая; 4. Розетка на удлинитель 1-гнезд. переносная, каучук.; 5. Розетка силовая РЕ 5*32А 3Р+РЕ+N с креплением; 6. Удлинитель 3-фазный ПВС 5*4; 7. Удлинитель L=10 м; 8. Удлинитель L=20 м, 2 шт.; 9. Удлинитель L=40 м; 10. Удлинитель У10-001 10 м, 3 шт.; 11. Разъем сил. вилк. 3SP1-024 63А; 12. Разъем силовой НТ-025 32А; 13. Разъем силовой НТ-125 32А, 2 шт.; 14. Провод ПВС 3*2,5(м), 31 м; 14. Провод ПВС 5*4 (м), 42 м; 15. Стартер ST 111 BASIC смол., 24 шт.; 16. Разъем РШ/ВШ-30, 11 шт.	416,70	41,67	20,84
42	1. Форма куба ЗФК-100 (госповерка); 2. Форма куба ЗФК-100 (госповерка); 3. Форма куба ЗФК-100 (госповерка)	270,00	27,00	13,50
43	1. Стол компьютерный; 2. Стол письменный 2-тумб. зак., 2 шт.; 3. Стол-приставка заказная 1,0, 2 шт.; 4. Шкаф 47*40*217	152,10	15,21	7,61
44	1. Тел сот Nokia x2-02 RM-694; 2. Факс Panasonik KX-FT 982 RU-B	102,60	10,26	5,13
45	1. Щит учета (зд. проходной); 2. Щит учета № 1; 3. Щит учета № 2; 4. ЩУРН-3ф передвижной с ДМ; 5. Трансформатор	218,70	21,87	10,94
46	1. Эл. чайник «Люкс» 1.7 л; 2. Электрочайник «Атлант» 1,8/1,9-220 ЭЧТ3 с д/м; 3. Электрочайник «Атлант» 1,8/1,9-220 ЭЧТ3 с д/м; 4. Электрочайник Polly № 1,7 л с сигнал. рубин (нерабочи); 5. Электрочайник ЭЧТ31,8/1,9-220 01 «Атлант» с д/м н/р; 6. Мешки пылесб. ECO-104 к пылесосам BOSCH PAS, 4 шт.; 7. Замок врезной мод. Ш 025В; 8. Гладилка швейц.13*58; 9. Обогреватель электр. масл. 1,5 кВт; 10. Печь СВЧ «HORIZONT» 17 MW700-1378B, 2 шт.	269,10	26,91	13,46
47	1. Стол письмен. с приставкой; 2. Стол-прист. заказ. 0,9х0,45; 3. Стол-приставка заказная 0.6	192,60	19,26	9,63
48	1. Электродвигатель АИР 100S4; 2. Электродвигатель ИВ-117-2	261,00	26,10	13,05
49	1. Чайник электрич. POLLY-Люкс; 2. Чайник электрич. POLLY-Люкс ЕК-20; 3. Чайник электрич. POLLY-Люкс ЕК-20; 4. Чайник электрич. ЭЧТ3 1,8/1,9-220 мод. 01 «Атлант»; 5. СВЧ-печь; 6. Рукосушитель автоматический	162,90	16,29	8,15
50	Теодолит 3 т 5КП № 36056	1260,00	126,00	63,00
51	1. Струбцина ленточн. для стяжки полов 120*5000, 2 шт.; 2. Съмник проф. 300 мм; 3. Тачка WB5009 R; 4. Тиски для труб № 2 б/у; 5. Толщиномер неотвердевшего слоя Константа ГЗ(ГП); 6. Топор А-0 0,9 кг в сборе 1,2 кг; 7. Топор метал. с дерев. топорищ.10514; 8. Траверса; 9. Траверса; 10. Набор щупов (госповерка)); 11. Насос электр. профес. погружной; 12. Ножницы по мет. 260 мм; 13. Кувалда 3 кг	233,10	23,31	11,66
52	1. Углометр с нониусом (РФ) 4УМ (10') (госповер.); 2. Угольник слесар. 160*100 3 кл.; 3. Угольник столярный 1000 мм; 4. Рулетка 3 м (госповерка)	376,20	37,62	18,81
53	1. Теодолит 2 т 30П № 09628; 2. Рейка измерительная GR500 TELESKOP-NIV, BOSCH	597,60	59,76	29,88
54	1. Сканер Epson Perfection V33, Финляндия; 2. Сот. тел. Nokia 359033044101168; 3. Стул PR ST Pt; 4. Сумка для ноутбука 15,6", 3 шт.; 5. Излучатель эл. инфракр., 2 шт.	199,80	19,98	9,99
55	1. Труба в/ст 5005 п/э, 8.24 м; 2. Труба водосточная, 4 шт.; 3. Рукав 111-9-2.0, 40 м п.; 4. Отвод желоба ОЖВ120/О-Пэ-С; 5. Отвод желоба ОЖВ150/О-Пэ-С, 2 шт.; 6. Манометр МП-50; 7. Манометр МП-63; 8. Клапан обратный; 9. Водомерный узел	108,42	10,84	5,42
56	1. Сварочный аппарат JASIC ARC 200; 2. Резак проп. Р1 «Донмет» 142; 3. Резак проп. РС-3П-100 (9/9) «РО-АР»; 4. Регулятор РДСГ 1-0,5 (50 л); 5. Редуктор БКО-50-4м кислород; 6. Щиток защит. лиц. для электросвар., 2 шт.; 7. Маска (щиток) сварщика НИП-У1; 8. Редуктор углекислотный УР-6-6; 9. Подогреватель ПУ-1 (для подогрева углекислоты)	279,00	27,90	13,95
57	1. Замок клиновый, 75 шт.; 2. Замок универс. оц., 55 шт.; 3. Кронштейн подмостей, 25 шт.	972,00	97,20	48,60
58	Имущество согласно списку № 5: https://docs.google.com/document/d/1l3vPdVS8bAXiRVgH6-J50hWNstVovCuy/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	482,94	48,29	24,15
59	Лист проф. гладк. П-1250*L/0,5-ЛКПЦ-Пэ-С-RAL9003, 1.25 м²	6,75	0,68	0,34
60	1. Захват для бордюр, 3 шт.; 2. Захват крановый «Гамма», 2 шт.	442,80	44,28	22,14
61	Жидкотопливный воздухонагреватель МАК 25	693,00	69,30	34,65
62	1. Дрель GBM 10-2 RE (БЗП); 2. Дверной блок ДГФ 2,1х1,0 межкомнатный; 3. Диск 190*2,0*30 мм; 4. Заклепка 4,0*8 ZK алюм/ст, 0.23 т.шт.; 5. Заклепочник 250 мм; 6. Абраз. сетка 115/280 (50 шт.), 2 упак.; 7. Вибронаконечник к ИВ-117 ф51; 8. Бур садовый ф250; 9. Ведро пожарное, 2 шт.; 10. Грунтовка белая «Тайфун мастер» № 100, 10 кг; 11. Лампа паяльная 1,5 л, 2 шт.; 12. Припой ПОС-61 ф3 мм (фас. 1. кг), 0,6 кг; 13. Уровень МААN 1200 мм; 14. Уровень брусковый 1,0 м; 15. Огнетушитель ОП-4(3), 3 шт.; 16. Огнетушитель ОП-5, 2 шт.	522,99	52,30	26,15
63	Измеритель адгезии АР (решетка)	378,00	37,80	18,90
64	1. Кресло «Престиж», 5 шт.; 2. Полка навесная	244,80	24,48	12,24
65	Печь отопительно-варочная НОРМАЛЬ-2 антрацит. труб	189,00	18,90	9,45
66	Имущество согласно списку № 6: https://docs.google.com/document/d/1NJLLpjwfAkJpMzz_yEL2Kkdh-a_g-Cdd/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	947,09	94,71	47,35

В отношении лотов №№ 1–26 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 85 %.**
В отношении лота № 27 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 55 %.**
В отношении лота № 28 проводятся седьмые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 90 %.**
В отношении лота № 29 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 85 %.**
В отношении лотов №№ 30–66 проводятся вторые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 25 %.**
Ранее публикация о проведении аукциона размещалась в газете «Звязда» № 147 (30027) от 02.08.2023, стр. 15

Дата и время проведения открытого аукциона	**11 сентября 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)**
Срок приема заявлений и оплаты задатка	**с 10.00 29.08.2023 до 16.00 07.09.2023 года**
Местонахождение имущества	**Лоты №№ 1–26, 30–66: г. Гродно, ул. Дубко, д. 11. Лоты №№ 27–29: г. Гомель, ул. Пригородная, 31**

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту ___ ОАО «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ», проводимых 11.09.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по тел.: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % (семь процентов) от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней со дня заключения договора.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться по телефонам: по лотам №№ 1–26, 30–66 +375295894134, Ольга Михайловна; по лотам №№ 27–29 +375293045990, Дарья.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

Продавец	**Открытое акционерное общество «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ» (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375 29 304 59 90, 8017 255 29 28)**
Организатор торгов	**ООО «Фрондера»: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт: orgtorg.by 220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, офис 1127**

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении 12 **сентября** 2023 **года** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

ЛОТ № 1: изолированное помещение с инв. №300/D-678 площадью 960,7 кв. м, назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340100000001000921, площадь 0,1871 га (доля в праве 37/250); назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания многоквартирных жилых домов, встроенных изолированных помещений, не относящихся к жилищному фонду. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Привокзальная, 2 А-109

Начальная цена с НДС: **1 222 980,00** бел. руб. **Задаток (5 %)** с НДС: **61 149,00** бел. руб.

Заключены договора аренды с: РУП «Фармация» – до 24.09.2024 г.; ОАО «Белинвест Банк» – до 01.10.2023 г.; ООО «Городская сеть терминалов» – до 11.11.2023 г.; ИП Мишанина М.Н. – до 31.12.2023 г., ООО «ЕВРОТОРГ» – до 26.04.2027 г., ИП Стравинская-Халилзада – до 31.12.2024 г.

Продавец: ОАО «Табаквинторг», г. Гомель, ул. Могилевская, 1а. Конт. тел.: 25-26-46; +375 44 599-02-90

Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены продажи предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца ОАО «Табаквинторг»: р/с BY44PJCB30124055581 000000933 ОАО «Приорбанк» (г. Гомель, ул. Красноармейская, 3а), БИК PJCBBY2X, УНП 400078357.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений заканчивается 11.09.2023 г. в 16.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом **5 %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплатить предмет торгов **тремя равными долями** каждые **15 (пятнадцать)** календарных дней со дня заключения договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1,0 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ОДО «ЛИК-ПАРК»** (УНП 391279139), объявляет о проведении **08.09.2023 г.** в 12.00 публичных торгов по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2023/08/spisok-imushhestva-likpark.pdf

Местонахождение имущества: Витебская обл., Октябрьский с/с, д. Любово, ул. Офицерская, 7, ул. Белорусская, 12, 14, 16.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: **ОДО «ЛИК-ПАРК»**, +375296677582.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **07.09.2023 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933 в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **29.08.2023** по 17.00 **07.09.2023** по адресу: г. Минск, ул. Гурского д. 22б, ком. 501.

К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) следующие документы:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты проведения торгов.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Затраты на организацию и проведение торгов составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счета-фактуре, аукционный сбор по лоту № 1 – 1 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %), по лотам №№ 2, 3, 6 – 3 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %), по лотам №№ 4, 5 – 2 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %).

Дополнительные условия: ипотека, залог банка.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 15 календарных дней с даты проведения торгов.

Вялікая гутарка з Аляксандрам РАДЗЬКОВЫМ

«СВЕТ СПАЗНАЕЦЦА НЕ ТОЛЬКІ НАВУКОВЫМІ МЕТАДАМІ, АЛЕ І ПРАЗ МАСТАЦКІ ВОБРАЗ...»

У час нейрасетак і інфармацыйнага выбуху цяжка спрагназаваць лёс прыгожага пісьменства. Здаецца, мы толькі пачалі горача спрачацца, ці выцесніць электроная кніга папяровую... Сёння гэта не самая галоўная праблема літаратуры. З'яўляюцца ўсё новыя і новыя аспекты ў тым, як літаратура і ўвогуле мастацтва змяняюцца пад уплывам часу, як уздзейнічаюць на грамадства... Змянілася стаўленне і да асобы пісьменніка, яго ролі ў соцыуме. Сёння мы паразважаем пра гэта з вядомым грамадскім дзеячам, навукоўцам, пісьменнікам Аляксандрам Радзьковым.

— Аляксандр Міхайлавіч, падчас міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час» вы правялі паралелі паміж развіццём грамадства і квантавай фізікай... Між тым у адносінах да мастацкай літаратуры гавораць пра нейкі «магічны крышталь», нешта непадуладнае законам матэрыяльнага свету... Што такое, у вашым уяўленні, «магія мастацтва», і ці ўсё ў геніяльным творы ў працэсе яго ўзнікнення можна вытлумачыць навукай?

— Мне заўсёды ўяўлялася, што заканамернасці навакольнага свету шмат у чым адзіныя, і яны так ці інакш адносяцца і да жывога, і да нежывога свету. І ў той раз прысутных на сімпозіуме пісьменнікаў і журналістаў я спрабаваў пераканаць больш уважліва паставіцца да гэтай думкі. Пісьменнік — даследчык чалавечага грамадства, а ў аснове развіцця соцыуму, як і ў сучасным разуменні ўладкавання мікрасвету, гэта значыць у квантавай фізіцы, ляжаць імавернасныя законы. Мы ж сапраўды толькі з пэўнай доляй верагоднасці можам прадбачыць вялікае перасяленне народаў, сацыяльную рэвалюцыю ці сварку ў сваёй сям'і. Гэтак жа мы можам толькі прадбачыць каардынаты знаходжання элементарнай часціцы, нават ведаючы яе хуткасць, масу і напрамак пачатковага руху. Прыведу яшчэ адзін прыклад у доказ сваіх падыходаў для разумення рэчаіснасці, якая нас атачае. Яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя шатландскія навукоўцы звярнулі ўвагу на моцную і дзіўна ўстойлівую хвалю, якая на канале раптам узнікае перад носам карабля і потым, адарваўшыся ад яго, коціцца наперад з вялікай хуткасцю. Гэтыя хвалі потым часта назіралі на морах, акіянах і назвалі іх салітонамі. З'яўляючыся раптам, як быццам ніадкуль, яны маглі прывесці нават да караблекрушэння. Спатрэбілася прадметнае вывучэнне гэтай з'явы, якое дазволіла звязаць узнікненне салітонаў з такім паняццем, як няўстойлівасць. Аказалася, што з няўстойлівасцю звязана з'яўленне хваль-забойцаў у акіяне, узнікненне ў космасе зорак і... размеркаванне грошай сярод людзей!

Рабізна дробных хваль у акіяне няўстойлівая, магутнай плынню яна можа сфакусіравацца ў адну хвалю-салітон, якая здольная пераламаць велізарны танкер або круізны лайнер.

Гравітацыйная няўстойлівасць прыводзіць да ўзнікнення зорак — была раўнамерная матэрыя, але раўнамернае размеркаванне няўстойлівае, вось энергія і канцэнтруецца ў асобных месцах. Там і пачалі збірацца зоркі.

Чалавечае грамадства таксама няўстойлівае, таму, калі зладзіць раўнамернае размеркаванне грошай паміж усімі, пройдзе нейкі час, і ўсё зробіцца наадварот: у некаторых будзе шмат, у іншых — мала. Тут працуюць тыя ж законы няўстойлівасці. А размеркаванне грошай — гэта ўжо глыбока сацыяльныя пытанні. Колькі геніяльных пісьменнікаў спрабавалі вывучыць гэтую праблему?

Свет спазнаецца не толькі навуковымі метадамі, але і праз мастацкі вобраз. Адносіны паміж сацыяльнымі групамі, вызначэнне чалавекам свайго прызначэння ў грамадстве, заканамернасці праяўлення гераізму і схільнасцяў да заган — гэтыя і многія іншыя грамадскія праблемы вывучаюцца пісьменнікамі. Няхай у арсенале сваіх даследаванняў яны выкарыстоўваюць «магічны крышталь» ці «мастацкую магію», але, на мой погляд, яны абавязаны грунтавацца на разуменні агульных заканамернасцяў навакольнай рэчаіснасці і адчуваць іх праяўленне ў тых тэмах, з'явах, пра якія яны пішуць. Таму я адкрыта казаў, што на сімпозіуме мне не хапае прысутнасці сярод пісьменнікаў навукоўцаў. І не толькі грамадазнаўцаў, але і матэматыкаў, фізікаў, біёлагаў, хімікаў. Ім жа таксама ёсць што сказаць аб спазнанні навакольнага свету.

У такім выпадку ўзнікае пытанне — а як ты сам рэалізоўваеш такія творчыя ўстаноўкі? Спрабаваў! Навуковыя — у кнігах па матэматыцы. У мастацкім выданні «Мой фізмат» прапанаваў аналіз універсітэцкага жыцця на ўзроўні факультэта, у кнізе «Рэктары» намагаўся асэнсаваць, зразумець прызначэнне і адказнасць перад грамадствам гэтых людзей, «Аб матэматыцы і матэматыках» — выказаў жаданне сістэмна асэнсаваць развіццё навуковай галіны ў асобна ўзятай краіне. Як гэта ўсё атрымалася — меркаваць ужо не мне...

— Раймон Кено, французскі пісьменнік-эксперыментатар, сябар групы «Уліпо», сцвярджаў, што сучаснаму паэту нельга чакаць нейкага «натхнення», а трэба карыстацца метадамі дакладных навук, каб канцэнтраваць сваю свядомасць. У той час як сюррэалісты, наадварот, спрабавалі «метад аўтаматычнага пісьма» і сцвярджалі, што сапраўдны твор можа з'явіцца толькі ў стане «змененай свядомасці», да якога сябе, уласна кажучы, і спрабавалі даводзіць... І тыя, і другія нараджалі творы, якія засталіся ў гісторыі сусветнай літаратуры. Як думаеце, чые падыходы ўсё ж такі больш дзейсныя ў свеце, дзе творцаў выцясняюць нейрасеткі?

— Думаю, многія навукоўцы і літаратары, ды і ўвогуле ўсе адукаваныя людзі заўважалі за сабой, што не памятаюць дакладных фармулёвак правілаў арфаграфіі, а пішуць правільна. Чаму так, мне растлумачылі прафесійныя філолагі: правілы правапісу яшчэ ў школьныя гады нам уклалі ў галовы. Мы з тых часоў карыстаемся імі падсвядома, яны ўжо ў падкорцы галаўнога мозгу. Таму і паэты-рэалісты, і паэты-сюррэалісты падсвядома ў сваёй творчасці зыходзяць са зразумелых і прынятых да нашага часу аб'ектыўных законаў існавання і развіцця навакольнай рэчаіснасці. Трэба, аднак, прызнаць, што і навукоўцы далёка не ўсё ведаюць пра ўладкаванне нашага свету. Стывен Хокінг з гэтай нагоды неяк сказаў: «Я цяпер ведаю, як уладкаваны наш Сусвет, але не ведаю, навошта!» Таму ўсе думаючыя, творчыя людзі працягваюць спазнаваць наш свет ва ўсіх яго праявах, часам выказваючы вар'яцкія, на першы погляд, ідэі. Бо так ставіліся спачатку і да геаметрыі Лабачэўскага, і да тэорыі адноснасці Эйнштэйна, і да неўяўных законаў квантавай фізікі. А ў выніку ж усё аказалася рэальным, усё працуе! Трэба пагадзіцца, што творчыя людзі свае разважанні ці іх высновы часта ўвасабляюць у вельмі незвычайную форму. Напрыклад, адзін з самых вядомых сюррэалістаў Сальвадор Далі свае роздумы аб паняцці часу выказаў у карціне «Заўсёднасць памяці» ў выглядзе размякчанасці гадзіннікаў, якія звісаюць і сцякаюць са стала. Падобна, ён інтуітыўна адчуваў і фізічную, і філасофскую складанасці паняцця часу. Дзе тут заканчваецца рэалізм і пачынаецца сюррэалізм?

Дададзім да гэтага тысячагадовую ўстойлівасць прыхільнасці людзей да рэлігіі. Калі мы нешта яшчэ не можам зразумець — у гэта верым! У Бога верылі і працягваюць верыць і масцітыя навукоўцы, і вядомыя паэты. А нейрасеткі — гэта прадукт творчасці рэальных людзей, але не генератар новых ідэй.

— Дарэчы, пра нейрасеткі... Ва ўсім свеце творцы занепакоеныя, што штучны інтэлект не проста складзе ім канкурэнцыю, але выцесніць з рынку. На канферэнцыях і семінарах праводзяць адналькавыя эксперыменты: даюць адрозніць твор штучнага інтэлекту ад твора жывога чалавека. І кожны раз канстатуюць: адрозніць цяжка, а часам немагчыма. Дык ці ёсць нейкія ўласцівасці «жывой творчасці», якія не зможа засвоіць ІТ, або прафесіі пісьменніка і мастака знікнуць, як зніклі прафесіі тэлефаніста і ліхтаршчыка?

— Штучны інтэлект, нейрасеткі — натуральнае развіццё сучасных тэхналогій. Гэта не спыніць. І, як заўсёды, новаўвядзенні апярэджваюць гатоўнасць грамадства іх прыняць. Так было са з'яўленнем кнігі, вынаходніцтвам паравога рухавіка, уваходжаннем у паўсядзённае жыццё кінематографа і паўсюднай камп'ютарызацыяй. Але ж усё выходзіць ад інтэлекту, ад розуму чалавека. Ён у аснове прагрэсу. Тут вельмі важна правільна распарадзіцца новымі навуковымі дасягненнямі, накіраваць іх на дабро, а не на шкоду чалавеку. Атамную энергію таксама спасціг розум, але яна можа быць накіравана як на мірныя энергетычныя патрэбы, так і на стварэнне страшнай зброі масавага знішчэння. Ад штучнага інтэлекту, ад нейрасетак таксама можна атрымаць велізарную карысць і страшную шкоду. І мы зноў вяртаемся да чалавечага розуму ў надзеі, што ён правільна распарадзіцца дадзеным новаўвядзеннем.

Цікава, шмат што ў функцыянаванні чалавечага арганізма мы вывучылі і зразумелі, напрыклад, ведаем як выпрацоўваюцца кроў, лімфа, сліна, але да гэтага часу не разумеем, як выпрацоўваецца думка. Менавіта чалавечае мысленне ў аснове творчасці. Веды, досвед, інтуіцыя спараджаюць новую думку, арыгінальную ідэю, прывабны мастацкі вобраз. Штучны інтэлект пакуль можа толькі скамбінаваць з наяўнага інфармацыйнага масіву па ўведзенай у яго чалавекам праграме жаданы вынік. Ён не валодае інтуіцыяй, не здольны на інсайт. Таму і літаратурных шэдэўраў ад штучнага розуму наўрад ці варта чакаць. Прынамсі пакуль.

— А ці можна з дапамогай матэматыкі дакладна пралічыць поспех кнігі ў чытача?

— Можна! Але гэта запатрабуе часу і выдаткаў не менш, чым на напісанне самой кнігі. Вось схема такой працы. Для пачатку трэба зразумець, на якую чытацкую аўдыторыю ты разлічваеш з ідэяй сваёй кнігі. Колькі людзей у гэтай меркаванай аўдыторыі? Трэба вызначыць каэфіцыент тых, хто яшчэ чытае кнігі ў гэтай супольнасці. Пастарацца зрабіць своечасовы і інтрыгоўны анонс задуманага твора. Задзейнічаць для гэтага наяўную ў цябе, пажадана паўсюдную, сяброўскую агенturу. На падставе верагоднасных разлікаў вызначыць аптымальны наклад выдання, устанавіць правільную цану кнігі. Вывярыць разам з выдавецтвам эфектыўную сетку распаўсюджвання накладу, правільна разлічыць пастаўкі ў кніжныя і інтэрнэт-крамы. Прэзентацыі, выступленні перад чытачамі, распаўсюджванне інфармацыі па ўсіх магчымых інфармацыйных каналах. Тут таксама патрэбен матэматычны разлік — усё не ахопіш, сіл і часу на гэта не хопіць, а навуковы падыход дапаможа вызначыць аптымальную мадэль прасоўвання ў жыццё твайго твара. Чаканне, што па тваю кнігу ўсе адразу стануць у чаргу — вялікая памылка. Тым больш цяпер, калі кнігі чытаюць менш і менш. Таму ўсе прапанаваныя дзеянні пажадана здзейсніць. Хоць, нават пры дасканала вывераных табой разліках неабходнасць выдання тваёй кнігі, як і ее тыраж, усё роўна вызначыць выдавецтва. Застаецца толькі спадзявацца, што ў яго таксама ёсць для гэтага матэматычны разлік.

Для прасоўвання да чытача сваёй кнігі дам адну параду, якой карыстаюся. Паўсюдна сцвярджаю, што кнігі сёння чытае толькі эліта. Збольшага гэта так і ёсць. Чытанне развівае мысленне, уяўленне, узбагачае новымі ведамі больш глыбокага, філасофскага характару, дазваляе ў патрэбных колах бліснуць веданнем сучасных літаратурных плыняў і модных выданняў. Ды і друкаваныя выданні цяпер нятанныя. Эліта, безумоўна, складаецца з вельмі адукаваных і заможных людзей. А хто не жадае сябе да яе аднесці?! Вось і купляюць кнігі.

— Ці верыце вы, што ў кожнага мастацкага твора існуе нейкае энергетычнае поле, якое ўплывае на ўспрымальніка? Ці адчувалі яго выразна, і якога кшталту? Станоўчае, адмоўнае?

— Упэўнены, што так. Праз мастацкі вобраз перадаецца комплексная плынь рацыянальнай і пачуццёвай інфармацыі. Уздзеянне на спажыўца гэтай плыні можна вызначыць і як энергетычнае поле, тым болей што такое поле не ведаюць нават фізікі. Вядомыя да цяперашняга часу палі (гравітацыйнае, электрамагнітнае, поле Хігса) мы ўспрымаем толькі па вызначаным уздзеянні на навакольнае асяроддзе, але іх фізічную прыроду пакуль не разумеем. Аднак да зямлі нас прыцягвае грунтоўна і токам можа стукнуць адчувальна. Так і музыка, карціна, кніга напэўна ўздзейнічаюць на чалавека энергетычна — могуць выклікаць радасць ці страх, смех ці слёзы, душэўны ўздым ці глыбокае засмучэнне.

У прыродзе існуе фізічная з'ява рэзанансу, гэта калі амплітуда змушаных ваганняў сістэмы ўзмацняецца пры супадзенні частаты вонкавага ўздзеяння на гэтую сістэму з частатой яе ўласных ваганняў. Падобна, рэзанансным падыходам можна ў нейкай ступені растлумачыць і асабістае ўспрыманне мастацкага вобраза, у прыватнасці кнігі. Адкрываеш яе — і тут жа фізічна адчуваеш (ці не адчуваеш) хваляванне, як расце цікавасць да таго, пра што там напісана. Гэта комплекснае ўспрыманне — тэма, аўтар, фабула, знешні дызайн, шрыфт, форма падачы матэрыялу. Калі змест захапляе — рэзананс узмацняецца, калі да напісанага губляецца цікавасць — ён згасае. Бывае, што такое станоўчае рэзанаснае адчуванне кнігі хочацца паўтарыць, тады яе перачытваеш. А здараецца, што кніга ні адразу, ні з часам не выклікае трапятання, не ўзмацняе сэрцабіцця — значыць, яна табе не рэзанансная. Не, яна не дрэнная, можа быць, і вельмі добрая, але — не твая!

— Ці ёсць кнігі, якія вы не жадалі б мець у хатняй бібліятэцы?

— Упэўнены, што практычна кожны здаровы чалавек фізічна адчуваў пэўныя табу на мадэляванне мозгам тых ці іншых жыццёвых працэсаў. Напрыклад, учыненне гвалту, крывавага злачынства. Або адхіленні ад прыродных фізіялагічных патрэб, у прыватнасці брыдкае навязванне грамадству аднаполага кахання. Быў выпадак, калі ў нашым мікраяне гвалтаўнік звёў з сабой шасцігадовую дзяўчынку, і праз тры дні ў рацэ знайшлі яе расчлянёнае цельца. Мой мозг аналізаваў двары, дзяцей, якія гуляюць, нават размову гэтай дзяўчынкі са злачынцам, але далей проста адмаўляўся працаваць, блакіраваў нават думкі аб тым, што давялося перажыць гэтаму дзіцяці. Таму я не люблю і не хачу чытаць кнігі з вычварэнствам, крывавым гвалтам, прапагандай чужых чалавеку захапленняў.

Падрыхтавала Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

(Працяг будзе.)

«Беларусы жывуць у раі, таму наша задача — захаваць яго для нашчадкаў»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як адзначыў на ўрачыстым адкрыцці **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК**, забеспячэнне камфортнага і здаровага навакольнага асяроддзя, спрыяльных умоў жыцця цяперашніх і наступных пакаленняў — асноўныя ўмовы для рэалізацыі ўстойлівага развіцця нашай краіны. Галоўныя падзеі Экалагічнага тыдня (ECOLOGY EXPO — 2023 і XVII Рэспубліканскі экалагічны форум) «накіраваны не толькі на прэзентацыю вынікаў, дасягнутых у прыродаахоўнай галіне, але і выяўленне новых перспектыў яе далейшага развіцця... Агучаныя падчас форуму цікавыя ідэі і прапановы лягуць у аснову канкрэтных мерапрыемстваў па вырашэнні экалагічных праблем, што будзе садзейнічаць далейшаму ўстойліваму развіццю нашай краіны».

У сваю чаргу, **намеснік Старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны кардынатар па дасягненні МУР Валерый БЕЛЬСКІ** адзначыў: «XVII Рэспубліканскі экалагічны форум адпавядае мэтавым устаноўкам дзяржавы. Нават на нашым сцягу ёсць зялёная паласа, гэта значыць, для нас важная прырода і яе багацце. Шмат маіх калег з паўднёвых краін пасля знаёмства з нашай прыродай прызнаваліся, што беларусы жывуць у раі, таму наша задача — захаваць яго для нашчадкаў, а для гэтага неабходны абмен досведам, тэхналогіямі, якія дазваляюць забяспечыць перапрацоўку адходаў. Мы — індустрыяльная краіна з развітым спажываннем». У якасці прыкладу Валерый Бельскі прывёў багаты айчынны вопыт, атрыманы падчас даследаванняў наступстваў радыеактыўнага забруджвання для жывёльнага і раслінага свету, і падкрэсліў гатоўнасць айчынных навукоўцаў да дыялогу з замежнымі калегамі.

Цырымонія адкрыцця завяршылася ўзнагароджаннем супрацоўнікаў прыродаахоўных ведамстваў, грамадскіх экаактывістаў, прадстаўнікоў тэрытарыяльнай улады за дасягненні на ніве аховы навакольнага асяроддзя. Так, былі ўручаны падзякі Старшыні Савета Рэспублікі, ганаровыя граматы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, падзякі прэм'ер-міністра, нагрудны знак Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь «Ганаровы эколаг» і г. д. Атрымалі дыпломы і пераможцы рэспубліканскага агляду-конкурсу на найлепшае добраўпарадкаванне паверхневага воднага аб'екта, рэспубліканскіх конкурсаў на найлепшага грамадскага эколага і найлепшую публікацыю на экалагічную тэматыку ў 2023 годзе.

Месца правядзення мерапрыемства было выбрана невыпадкова: Палессе — унікальны рэгіён, які захаваў розныя віды экасістэм, нездарма ж 40 % земляў Століншчыны адносіцца да асабліва ахоўных прыродных тэрыторый. Апрача таго, як паведаміў кіраўнік Мінпрыроды, «Брэстчына — адзін з найбольш развітых рэгіёнаў краіны ў сферы здабычы і перапрацоўкі мінеральнай сыравіны: тых рэсурсаў, якія адыгрываюць важную ролю ў эканоміцы вобласці і дзяржавы ў цэлым».

Важныя для развіцця рэгіёна і аховы навакольнага свету падарункі атрымала і Століншчына. Для вёсак Рэчыца і Манькавічы было закуплена 3850 кантэйнераў для збору адходаў, для работнікаў фельчарска-акушэрскіх пунктаў — дзесяць электравелаасіпедаў, для сацработнікаў — тры электравелаасіпеды і скутар. Для дамоў сямейнага тыпу і Цэнтра турызму прызначаны 21 электравелаасіпед і чатыры электрасамакаты.

Дэлегатам была прапанавана насычаная разнапланавая праграма: правядзенне патрыятычнага мітынгу-рэквіема памяці ахвяр фашызму ва ўрочышчы Стасіна; закладка алеі; адкрыццё заказніка мясцовага значэння «Пойма Львы»; дыскусійныя пляцоўкі (навукова-практычная канферэнцыя «30 гадоў Нацыянальнай сістэме маніторынгу навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь», круглыя сталы «Развіццё экалагічнага турызму ў Рэспубліцы Беларусь» і «Аб перспектывах развіцця мінеральна-сыравіннай базы Брэсцкага Палесся»).

Ва ўрочышчы Стасіна, у катлаване, што выкапалі да вайны для будоўлі аэрадрома, з 1942 да 1944 года нацысты расстралялі 5332 мужчыны, 3620 жанчын і 3548 дзяцей. Цяпер на гэтае месца вядзе «Дарога памяці і смутку» — шлях, якім прайшлі 12,5 тысячы бязвінных ахвяр, што проста хацелі жыць і працаваць на роднай зямлі.

Адной з самых значных падзей стала канферэнцыя «Міжсектаральнае супрацоўніцтва ў кантэксце дасягнення МУР». На працягу трох сесій выступоўцы разам з кіраўніком прыродаахоўнага ведамства Андрэем Худыком і намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, нацыянальным каардынатарам па дасягненні МУР Валерыем Бельскім абмяркоўвалі сучасны стан і сістэмныя кліматычныя рашэнні ў кантэксце ўстойлівага развіцця, пытанні фінансавання такой дзейнасці. У прыватнасці, былі агучаны меры, якія прымаюцца для забеспячэння ўсеагульнага доступу да недарагіх, надзейных і сучасных крыніц энергіі, стварэння спрыяльных умоў для жыцця грамадзян і аховы навакольнага асяроддзя, змякчэння наступстваў змены клімату, а таксама вынікі выканання хуткай комплекснай ацэнкі мерапрыемстваў дзяржаўных праграм з пазіцыі МУР, новыя інструменты фінансавання выдаткаў на біяразнастайнасць на прыкладзе метадалогіі ПРААН, экаініцыятывы ад Маладзёжных паслоў МУР і іншае.

Падчас форуму адбылося зарыбленне вадасховішча Вялікія Арлы (Дубянецкае), дэлегаты наведалі экалагічную сцежку «Альманскія балоты», фестываль коней «Палеская ніва — 2023», што стаў фінальным акордам форуму. У гарадскім парку праходзілі экавіктарыны, гульні і майстар-класы (у тым ліку ад супрацоўнікаў Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь), у якіх з вялікай цікавасцю ўдзельнічалі не толькі дэлегаты, але і месцічы; выстава дасягненняў і навацый прадстаўнікоў дзіцячых і падлеткавых экааб'яднанняў, Горад майстроў з традыцыйнымі беларускімі і экавырабамі — жыхары Століншчыны розных узростаў імкнуліся зрабіць свой унёсак у вялікае экалагічнае свята раёна. Як адзначыў намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валерый Бельскі, такія неабыякавыя адносіны і наогул мода на экалагічны лад жыцця, якая існуе сёння ў беларускім грамадстве, — вынікі велізарнай экаасветнай работы з насельніцтвам, значнай часткай якой з'яўляецца і XVII Рэспубліканскі экалагічны форум.

Александрына ПАРШЫНА. Фота Андрэя КАРАБЕЛЬНІКАВА.

Тэрыторыя клопату

«Кіношны» двор стане зелянейшым

Жыхары мікрараёна ў Гродне ўзялі ўдзел у экалагічным тыдні

Гродзенскія экаактывісты працягваюць азеляненне сваіх дваровых участкаў. Некалькі гадоў таму ў мікрараёне Дзевятоўка высадзілі клёны, летась — бярозкі і елачкі. Увосень мяркуюць падысці да зялёнай зоны больш дэталёва. А падчас экалагічнага тыдня сабраліся, каб абазначыць маладыя саджанцы і тым самым зберагчы іх ад выкошвання.

Двор гэты знакаміты. Роўна 40 гадоў таму тут здымалі папулярны фільм «Белыя Росы». Мясцовыя жыхары, тады яшчэ маладыя навасёлы мікрараёна, прыходзілі паглядзець, як іграе на гармоніку ў гняздзе на старым дубе Мікалай Карачанцаў, як кідаецца пад колы хуткай дапамогі Барыс Новікаў.

З той пары многае змянілася. Няма таго дуба, наваколле набыло іншыя рысы, знікла вёска, а на яе месцы вырас і працягвае расці гарадскі мікрараён. Праўда, некаторыя дрэвы засталіся. У дварах, дзе ішлі здымкі, можна ўбачыць даволі старыя ліпы, але ніхто дакладна не ўспомніць, калі яны пасаджаны. Ва ўсякім разе, з-за будаўніцтва нямала дрэў загінула.

А вось з азеляненнем тут, відаць па ўсім, не вельмі спяшаліся. На гэта і звярнулі ўвагу мясцовыя жыхары, якія ў юбілейны год здымак «Белых Рос» вырашылі стварыць на месцы колішняй кінапляцоўкі паркавую зону.

Такія спробы былі і раней. Некалькі гадоў таму на месцы «кіношнага» дуба актывісткі пасадзілі малады клёнік і некалькі кустоў. Летась у сваім двары высадзілі алею бярозак і елачак. На жаль, амаль усе дрэўцы загінулі. Але жанчыны не апускаюць рукі.

— Мы звярнуліся да мясцовых улад, узгаднілі свае дзеянні з інспекцыяй па аховe прыроды. Атрымалі дазвол на правядзенне акцыі, — адзначае жыхарка Дзевятоўкі Тэрэза Белавусава. — Маем намер азеляніць навакольную тэрыторыю. Гэты працэс не стыхійны, ён праходзіць у рамках праекта па азеляненні тэрыторыі, які падрыхтавала прадпрыемства «Зелянбуд». Праект узгаднілі многія ведамствы, у тым ліку ЖЭС, на тэрыторыі якой будзе праходзіць акцыя.

Асноўную работу мяркуецца правесці ўвосень. Для гэтага жыхары мікрараёна заказалі ў «Зелянбудзе» дрэвы. Дарэчы, на прадпрыемстве абяцалі выдзеліць іх бясплатна ў рамках абласной праграмы «Зялёныя тэхналогіі, рэсурсакарыстанне і экабяспека».

— Калі ёсць дапамога, лягчэй працаваць. «Зелянбуд» дапамагае з саджанцамі, а мы актывізуем грамадзян на працяг справы. На гэтым экалагічным тыдні абазначым, дзе і што садзіць. З дапамогай спонсараў пазначым калкамі малыя расліны, — працягвае экаактывістка.

У полі зроку жыхароў і кантэйнерная пляцоўка для збору адходаў. Паколькі яна размешчана насупраць пад'ездаў, вырашылі высадзіць вакол дрэвы і кусты. Прапанова будзе разглядацца ў жыллёва-камунальных службах.

— У схеме, якую даў «Зелянбуд», намецім, дзе хочам пасадзіць дрэвы, — гэта неабходна, каб не закрануць інжынерныя камунікацыі, — тлумачыць суразмоўніца.

Ёсць ідэя разбіць кветнік. Жыхары гатовыя не толькі высаджваць расліны, але і даглядаць іх. Яны хочуць зрабіць больш зон адпачынку, бо месца тут знакамітае. Аб гэтым сведчыць і вялікі парк, дзе размясціўся імправізаваны дом са скульптурамі некаторых герояў «Белых Рос». Мясцовыя жыхары лічаць, што некаторыя шыльды варта ўстанавіць непасрэдна на месцах здымак. Напрыклад, на месцы старога дуба. Таксама не лішне было б замяніць лаўкі.

— У ЖЭСе мы атрымалі дазвол зрабіць іх сваімі сіламі, каб было хутчэй. Шукаем спонсараў. Цяпер нам дапамагаюць прадпрыемствы «ГроднаГандальСэрвіс», «Інстытут Гроднаграмадзянпраект», — расказвае актывістка. — Мы хочам зрабіць унікальны гарадскі куток.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

БУЛЬБА ХЛЕБ БЕРАЖЭ!

«Бульбяны разгуляй» і «Дажынкі» адзначылі ў Цырыне

Адразу два асноўныя прадукты беларускага стала — хлеб і бульбу — ушанавалі ў аграгарадку Цырын, што на Карэліччыне. Падзякаваць хлебаробам за збор ураджаю і пакаштаваць каравай, атрымаць Ордэн Белага Клубня і высветліць, у каго ўрадзіла самая буйная бульба... Гэта і яшчэ шмат цікавага чакала гасцей падчас «Бульбянога разгуляю» і «Дажынак» прадпрыемства «Лукі-Агра».

33 дні жніва і прыстойны вынік

«Нічога мацнейшага за хлеб няма на зямлі»: такімі словамі сустракалі госці каравай новага ўраджаю, якія з малітвай асвяціў айцец Алег. Уласна, гэтым і распачаліся мясцовыя «Дажынкі».

Сёлета на Карэліччыне вырашылі не адзначаць свята хлеба ў маштабах раёна, а рабіць яго на месцах, каб такім чынам падзякаваць кожнаму, хто шчыраваў на жніве, а не толькі перадавікам. Проста ў полі прымалі першыя «Дажынкі» ўдзельнікі жніва гаспадаркі «Цырын», праз некалькі дзён павіншавалі працаўнікоў гаспадаркі «Свіцязянка», пабывалі на прапрыемстве «Племзавод Карэлічы», не абмінулі гаспадарку «Малюшычы».

— Мы вырашылі сёлета больш актыўна ўдзельнічаць і ў мясцовых «Дажынках», і ў працэсе жніва (непасрэдна падчас яго і пры падвядзенні вынікаў), бо ўсё добра ў пару. Калі людзі сапраўды амаль суткамі знаходзяцца на рабочых месцах, хочацца іх і павіншаваць, і падтрымаць, і падзякаваць за работу, — заўважыў **Генадзь ШАТУЕЎ, старшыня Карэліцкага райвыканкама**. — Кожная ўборачная кампанія не падобная на іншую. Сёлета былі перажыванні, што не зможам сабраць неабходны ўраджай хлеба, бо засушлівая вясна крыху паўплывала на яравыя пасевы, аднак у цэлым па раёне

паказчык — намалочана 17 487 тон збожжавых і зернебабовых культур, так што людзі будуць з хлебам, а жывёлагадоўля — з кармамі, падкрэсліў старшыня райвыканкама, віншуючы найлепшых удзельнікаў жніва.

Ён дадаў, што сёлетні падыход да арганізацыі «Дажынак» дазволіў кіраўніцтву раёна даехаць да кожнага экіпажа і не губляць час, ладзячы раённае свята. Праз гэта карэліччане адны з першых у вобласці справіліся з сяўбой азімага рапсу (замест вызначанага Мінсельгасам 25 жніўня скончылі пасяўныя работы 22-23 жніўня). Гэта пры тым, што жніво расцягнулася на 33 дні.

— Залог будучага ўраджаю закладваецца цяпер праз правільны падбор сяўбы, насення, угнаенняў і аптымальныя тэрміны. Сёлета Карэліччына стала чацвёртай сярод раёнаў вобласці па ўраджайнасці і чацвёртай па валавым намалоце, хоць па плошчах наш раён займае 15-16-е месца з 17 раёнаў Гродзеншчыны, — удакладніў Генадзь Шатуеў і заўважыў, што працаўнікам Карэліччыны ёсць з чым паехаць на абласныя «Дажынкі».

Хлебаробская салідарнасць

На «Дажынках» у Цырыне ўганаравалі дзесяць экіпажаў камбайнераў і 14 кіроўцаў, якія перавозілі ўраджай; работнікаў зернесушыльных комплексаў; тых, хто працаваў на прыёмцы ўраджаю; кіроўцаў пагрузчыкаў; работнікаў сталовай і кіроўцаў, якія дастаўлялі абеды ў поле.

атрыманы прыстойны вынік. Сабрана 16 745 тон рапсу пры ўраджайнасці 42,5 цэнтнера з гектара. Такога паказчыка ў раёне ніколі не было, а калісьці мы марылі сабраць хоць бы 8-10 тысяч тон. Ужата 104 777 тон зерня пры ўраджайнасці 60,5 цэнтнера з гектара. У Гродзенскай вобласці толькі чатыры раёны маюць паказчык звыш ста тысяч тон, і Карэліччына стабільна трымае такі вынік.

Тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца ў гаспадарках, штогод удасканальваюцца. Новы падыход у вытворчасці рапсу, збожжа, што быў закладзены летась улетку і ўвосень, разумнае вытрымліванне ўсіх тэхналогій і падрыхтоўка тэхнікі далі такі вынік сёлета. У гаспадарцы «Лукі-Агра» самы высокі

Летась усім камбайнерам падарылі пуцёўкі ў санаторый, аднак паехалі толькі трое з іх, таму сёлета падарункамі сталі грашовыя прэміі.

— Сёння мы аддаём павагу двум хлябам: хлебу збожжаваму і бульбяному. Першаму хлебу мы ўжо аддалі пашану — у нашай вялікай гаспадарцы ўбралі 3183 гектары збожжавых і зернебабовых, а таксама 700 гектараў рапсу. Чатыры камбайнерскія экіпажы намалацілі больш як дзве тысячы тон зерня, адзін з кіроўцаў перавёз звыш трох тысяч тон зерня. Звяно па дапрацоўцы сыравіны — зернесушыльны комплекс «Лукі» займае першае месца ў раёне (нарыхтаваў больш як дзевяць тысяч тон зерня), — адзначыў заслугі сваіх супрацоўнікаў **Мікалай ГАВІНА, дырэктар сельскагаспадарчага прадпрыемства «Лукі-Агра»**. — Асаблівае задавальненне ў мяне выклікае, што праявілася хлебаробская салідарнасць двух прадпрыемстваў, мужчыны працавалі сумленна і з павагай да хлеба, не прыйшлося клікаць на дапамогу людзей з суседніх гаспадарак.

Такія словы — не проста ветлівасць, а сапраўднае ўзаемаразуменне, якога дасягнулі работнікі дзвюх розных гаспадарак: прадпрыемстваў «Цырын» і «Лукі-Агра», якія аб'ядналі ў адно згодна з Указам № 399 «Аб фінансавым аздараўленні сельскагаспадарчых арганізацый».

— Цырын заўжды славіўся сваёй зямлёй, меў свой герб і сцяг, а Лукі — добрая і моцная гаспадарка. Аднак ва ўказе быў Цырын, і гаспадарка ўвайшла ў склад лукскай, аднак пры гэтым стала яшчэ больш моцнай і добрай, бо людзі паверылі, што можа быць высокі вынік, — падзяліўся старшыня Карэліцкага райвыканкама.

На свяце, дарэчы, пастараліся стварыць лакацыі так, каб максімальна задаволіць густ самых розных гасцей. Для працаўнікоў — удзячныя словы і ўзнагароды, для дзетак — аквагрым і дзіцячая пляцоўка, для ўсіх прысутных — конкурсы, пачастункі і канцэрт, каб «Дажынкі» запомніліся кожнаму нечым сваім.

Васпані бульба, мадам Пюрэ і бульбяныя прысмакі

А далей на свяце ўвагай гасцей завалодала яна — бульба, якая прапанавала спаборніцтвы, каб высветліць, хто заслугоўвае атрымаць з яе рук Ордэн белага Клубня: бульба ў мундзіры, мадам Пюрэ ці Чыпс. Для гэтага гасцям свята раздалі аркушы з літарамі, а ўдзельнікі камандаў трох

прэтэндэнтаў павінны былі сабраць іх і скласці слова «бульба». Хто хутчэй скончыць — таго і ордэн. Раскрыю сакрэт, першымі сабралі слова ў камандзе Бульбы ў мундзірах, але ж Васпані бульба так уразілася сустрэчай са сваімі сваякамі, што ўручыла ордэн усім тром.

«Бульбяны разгуляй» адзначаецца ў Цырыне ўжо другі раз і стаў брэндавым святам для гаспадаркі «Лукі-Агра», якая вырошчвае другога хлеба больш за ўсіх у раёне. Сёлета мерапрыемства праходзіць сумесна з «Дажынкамі», што куды прыемней, бо сабралася ўдвая больш людзей, перакананая **Аксана ГОМЗА, старшыня Цырынскага сельвыканкама**:

— Лічыцца, што бульба — другі хлеб. Першы (збожжа) у нас ужо сабраны, а ўшанаванне другога напярэдадні ўборкі — прадвеснік таго, што ўсё пройдзе паспяхова і мы атрымаем самую высокую ўраджайнасць у раёне. Тым больш на тэрыторыі нашага сельсавета працуе навукова-вытворчае прадпрыемства «Ніка», якое займаецца развядзеннем сартавой бульбы. Многія гаспадары таксама вырошчваюць бульбу на продаж, прычым робяць тое на вялікіх плошчах, да гектара.

Атрымаўшы ордэны, казачныя персанажы «Бульбянога разгуляю» адправіліся дэгуставаць стравы, каб вызначыць, хто з цырынскіх гаспадынь прыгатаваў найбольш уражальную і самабытную страву. Гаспадыні паэксперыментавалі з бульбай ад душы. Тут былі і торт «Мурашнік», і «Грыбная паляна», і «Ружачкі» — і ўсё гэта з бульбы. Першае месца, па рашэнні казачнай камісіі, падзялілі паміж двума прысмакамі: «Дуэтам» і «Клёцкамі па-беларуску».

Прызы атрымалі і аўтары найлепшых вырабаў з бульбы на конкурсе «Бульбяны цуд». Цікава, што большасць «свінак» ды «пеўнікаў» і іншых вырабаў была зроблена рукамі бібліятэкараў, якія на свята прывезлі шмат цікавай літаратуры пра бульбу. Ну і, вядома, кожны мог набыць на памяць пра свята сувенір ад майстроў Карэліцкага Дома рамёстваў. Узнагародзілі і тых, хто вырасціў «найбольшую бульбу» — іх выбіралі з вялізных клубняў у конкурсе «Бульбяны выкрутас».

А яшчэ на свяце гулялі ў бульбяныя шашкі, сілкаваліся ў кафэ «У бульбаша», спявалі і танцавалі на канцэрце ад артыстаў з Навагрудскага раёна, даведваліся смак першага каравая з новага ўраджаю і назапашвалі добры настрой і ўспаміны на наступны год, яшчэ толькі рыхтуючыся капаць бульбу, якую так шчыра ўхваляліў. Нездарма ж кажуць, што стол без бульбы — што вяселле без гарміоніка.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Извещение о проведении 29 **сентября** 2023 года торгов № 9-**РН** на право размещения средств наружной рекламы на государственном недвижимом имуществе в г. Минске

№ предмета торгов	Место размещения средства наружной рекламы (согласно схеме)	Размер рекламного поля, м	Площадь рекламного поля, кв. м	Количество рекламных полей, ед.	Общая площадь, кв. м	Вид средства наружной рекламы	Начальная цена, руб.
1	г. Минск, ул. Широкая, 40Б	2,0 х 8,0	16	2	32	пилон	1 184,0
2	г. Минск, ул. Бабушкина, 8	1,5 х 2,0	3	2	6	пилон	222,0
3	г. Минск, ул. Горецкого, 3	1,0 х 3,0	3	2	6	пилон	222,0
4	г. Минск, ул. Шаранговича, 22	6 х 3	18	2	36	щит	1 332,0

Срок, на который заключается договор на размещение (распространение) наружной рекламы, **составляет 5 лет.** Размер платы за оформление паспорта средства наружной рекламы составляет 581,21 бел. руб. с учетом НДС (без учета стоимости услуг по изготовлению проекта привязки средства наружной рекламы к участку местности)

Необходимые условия по предмету торгов № 1

Общие требования и характеристики. Для размещения требуется разработка проекта привязки средства наружной рекламы в установленном порядке. В основе пилона лежит металлический каркас. Количество опорных стоек: одна. Рекламная конструкция ставится на заглубленном фундаменте. Цвет рекламной конструкции, покрытие согласовывается при получении паспорта средства наружной рекламы. Рекламная конструкция должна иметь маркировку с указанием владельца и его контактного телефона, номера рекламной конструкции.

Размеры. Размер информационного поля: 2000 х 8000 мм, две стороны.

Площадь рекламного поля 16 кв. м.

Подсветка рекламной конструкции. Рекламная конструкция должна иметь внутреннюю подсветку. Подключение к источнику электроснабжения осуществляется закрытым способом с применением изолированного провода.

Необходимые условия по предмету торгов № 2

Общие требования и характеристики. Для размещения требуется разработка проекта привязки средства наружной рекламы в установленном порядке. В основе пилона лежит металлический каркас. Количество опорных стоек: одна. Рекламная конструкция ставится на заглубленном фундаменте. Цвет рекламной конструкции, покрытие согласовывается при получении паспорта средства наружной рекламы. Рекламная конструкция должна иметь маркировку с указанием владельца и его контактного телефона, номера рекламной конструкции.

Размеры. Размер информационного поля: 1500 х 2000 мм, две стороны.

Площадь рекламного поля 3 кв. м.

Подсветка рекламной конструкции. Рекламная конструкция должна иметь внутреннюю подсветку. Подключение к источнику электроснабжения осуществляется закрытым способом с применением изолированного провода.

Необходимые условия по предмету торгов № 3

Общие требования и характеристики. Для размещения требуется разработка проекта привязки средства наружной рекламы в установленном порядке. В основе пилона лежит металлический каркас. Количество опорных стоек: одна. Рекламная конструкция ставится на заглубленном фундаменте. Цвет рекламной конструкции, покрытие согласовывается при получении паспорта средства наружной рекламы. Рекламная конструкция должна иметь маркировку с указанием владельца и его контактного телефона, номера рекламной конструкции.

Размеры. Размер рекламного поля: 1000 х 3000 мм, две стороны.

Площадь рекламного поля 3 кв. м.

Подсветка рекламной конструкции. Рекламная конструкция должна иметь внутреннюю подсветку. Подключение к источнику электроснабжения осуществляется закрытым способом с применением изолированного провода.

Необходимые условия по предмету торгов № 4

Общие требования и характеристики. Для размещения требуется разработка проекта привязки средства наружной рекламы в установленном порядке. Количество опорных стоек: одна. Количество рекламных полей: 2.

Размер рекламного поля 6000 х 3000 мм. Площадь рекламного поля 18 кв. м.

Цвет рекламной конструкции, покрытие следует согласовать при получении паспорта средства наружной рекламы.

Рекламная конструкция должна иметь маркировку с указанием владельца и его контактного номера телефона, номера рекламной конструкции. Подключение к источнику электроснабжения осуществляется закрытым способом с применением изолированного провода.

Форма проведения торгов – аукцион.

Организатор торгов – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. 8 (017) 365-48-36.

Торги проводятся в соответствии с Положением «О порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 «О мерах по реализации Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам рекламы».

Аукционные торги проводятся **29 сентября 2023 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7.

Документы на участие в аукционных торгах принимаются **с 29.08.2023 по 25.09.2023** включительно с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

Порядок оформления участия в торгах: к участию в аукционных торгах допускаются лица, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток (задатки) и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в торгах;
- заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет организатора торгов (в случае участия в торгах в отношении нескольких предметов торгов задаток вносится по каждому из предметов торгов);
- копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающих принять участие в торгах;
- эскиз средства наружной рекламы, выполненный в цвете на бумажном носителе в формате А4 или электронном носителе.

Сумма задатка (сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов) должна быть внесена по соответствующему предмету торгов не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа 40901 (назначение платежа – задаток для участия в торгах № 9-РН на право размещения средств наружной рекламы по предмету торгов №_).

Участнику, не ставшему победителем торгов (лицом, приравненным к победителю торгов), внесенный задаток (задатки) возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

При подаче организатору торгов документов для участия в торгах и заключении соглашения представляются:

физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность;

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

После регистрации организатором торгов документов для участия в торгах лицо, желающее принять участие в торгах (его представитель), расписывается в журнале регистрации, после чего такое лицо считается допущенным к участию в торгах. До начала аукциона его участники проходят регистрацию.

Порядок определения победителя торгов: торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Торги проводит аукционист, определяемый организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены предмета аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю торгов.

Иные условия торгов:

победитель торгов (приравненное к нему лицо) обязан:

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** возместить государственному предприятию «МГЦН» затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под подпись;
- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** перечислить на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в протоколе о результатах торгов, сумму средств, за которую продан предмет торгов, за вычетом внесенной им суммы задатка;
- **в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов** заключить договор на размещение средства наружной рекламы с государственным предприятием «Минский городской центр инжиниринговых услуг», при условии оплаты суммы средств, за которую продан предмет торгов и оплаты расходов на организацию и проведение торгов.

За оформление паспорта средства наружной рекламы взимается плата в соответствии с тарифами, утвержденными государственным предприятием «Минский городской центр инжиниринговых услуг».

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

Телефоны для справок: отдел аукционов – (017) 360-42-22, (017) 365-48-36, государственное предприятие «Минский городской центр инжиниринговых услуг» – (017) 219-85-44.

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Объявления – Аукционы»).

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 29 сентября 2023 г. в 11.00 открытого аукциона по продаже оборудования цеха № 1, принадлежащего открытому акционерному обществу «Гродненский стеклозавод» на праве собственности

№ лота	Наименование и характеристика оборудования	Начальная цена, рублей (в т. ч. НДС 20 %)	Задаток, рублей (в т. ч. НДС 20 %)
1	**Автомат АПШ 12.00.000**, инв. № 0000044136. Для производства широкогорлой стеклотары, пр-ть стеклобанки 1000 см³ – 2538 шт./ч, 2003 г. в.	28 920,00	2 892,00
2	**Гранулятор стекломассы ГР-2,** инв. № 0000043056. Для гранулирования стекломассы, производительность 3 т/ч, габариты 2,95х2,01х16,5 м, 2004 г. в.	5 640,00	564,00
3	**Загрузчик печи отжига 23П-18,** инв. № 0000044199. Для автоматической загрузки стеклоизделий в печь отжига, макс. производительность 120 шт./мин., ширина сетки 1800 мм, габариты 4000х1400х1800 мм, 2004 г. ввода в эксплуатацию	4 440,00	444,00
4	**Конвейер ленточный ЦСТ-1-КЛ500,** инв. № 0000041145. Длина 13 м, шир. ленты 500 мм, ширина конвейера 800 мм, 2007 г. в.	3 720,00	372,00
5	**Конвейер ленточный ЦСТ-1-КЛ500-8-00-00-00СБ,** инв. № 0000041707. С сепаратором магнитным СМШ 40/60-07.033, 2007 г. в.	6 120,00	612,00
6	**Машина ЗПВМ3,** инв. № 0000044132. Для изготовления стеклотары широкогорлой, диаметр венчика 82 и больше, 1987 г. в.	12 000,00	1 200,00
7	**Печь отжига ПКГ-323,** инв. № 0000044226. Производительность 2000 кг/ч, коэффициент автоматизации 0,75, расход электроэнергии 9,8 кВт/ч, максимальная температура 873 °С, габариты 21540х3294х3960 мм, 2004 г. в.	56 640,00	5 664,00
8	**Питатель 1ПК-1552,** инв. № 0000044220. Для автоматического питания каплями стекломассы заданной массы, температуры и формы через равные промежутки времени, для машины ЗПВМ3, производительность 26 кг/мин, 2004 г. в.	17 400,00	1 740,00
9	**Прессовыдувная машина,** инв. № 0000044209. Для выработки широкогорлой стеклянной тары емкостью до 3 л, производительность 18 шт./мин., габаритные размеры 3300х2885х3085 мм, 2004 г. в.	12 480,00	1 248,00
10	**Транспортер «горячий» сетчатый ТГ-1/6,5с,** инв. № 0000044225. Для транспортирования стеклоизделий от автоматов выработки и дальнейшей передачи их на поперечный транспортер переставителя стеклоизделий (поворотным кругом). Габариты 5500х690х9900 мм, 2004 г. в.	2 160,00	216,00
11	**Упаковочная машина УПБ-1А,** инв. № 0000044203. Производительность 300 пак/ч, установленная мощность электродвигателя 1,09 кВт, нагревателей 20 кВт, габариты 4300х1240х1900 мм, 2004 г. в.	3 600,00	360,00
12	**Элеватор ковшовый,** инв. № 0000041345. Для подачи стеклобоя и гранулятора стекломассы в накопительный бункер, 1967 г. в.	1 920,00	192,00
13	**Электротельфер Т 10432,** инв. № 41797. Грузоподъемность 2 т, высота подъема 12 м, 2003 г. в.	1 200,00	120,00
14	**Вентилятор ВРП-0,1-4,0 (4/3000),** инв. № 41801, 2014 г. в.	946,60	94,66
15	**Вентилятор ВР 140-15 № 8,** инв. № 0000041574, 2004 г. в.	1 344,17	134,42
16	**Вентилятор ВР 140-15 № 8,** инв№ 0000041575, 2004 г. в.	1 250,03	125,00
17	**Вентилятор ВР 86-77 № 4 К/0,75/1500/ с виброизолят.,** инв. № 0000041730, 2008 г. в.	757,32	75,73
18	**Вентилятор ВР 86-77 № 6,3 ДУ-02 400 С(5,5*1435),** инв. № 0000040712, 2010 г. в.	1 003,43	100,34
19	**Дробилка стеклобоя ДБ-400,** инв. № 0000042139. Для измельч. стеклобоя, производительность 3 т/ч, мощность двигателя 3 кВт, 100 об./мин., 2004 г. в.	357,00	35,70
20	**Загрузчик шихты ЗШ-1,** инв. № 44276. Номин. пр-ть 120 т/сут., мощность двигателя 1,1 кВт, габаритные размеры 2680х566х1190 мм, 2003 г. в.	613,44	61,34
21	**Загрузчик шихты ЗШ-1,** инв. № 44277. Номин. пр-ть 120 т/сут., мощность двигателя 1,1 кВт, габаритные размеры 2680х566х1190 мм, 2003 г. в.	613,44	61,34
22	**Конвейер ленточный КЛ-200-00.00СБ,** инв. № 0000041740. Конвейер подачи стеклобоя, 2008 г. в.	1 363,25	136,33
23	**Машина упаковочная МЭТ-ПО5,** инв. № 0000044124. 1996 г. в.	2 112,82	211,28
24	**Переставитель угловой (трансфер) ТР-1,** инв. № 0000044229. Для упорядоченной передачи стеклотары с транспортера горячих изделий на транспортер переставителя, производительность 50 тш/мин., высота транспортируемых изделий 1000 мм, 2004 г. в.	1 302,89	130,29
25	**Переставитель угловой (трансфер) ТР-1,** инв. № 0000044230. Для упорядоченной передачи стеклотары с транспортера горячих изделий на транспортер переставителя, производительность 50 тш/мин., высота транспортируемых изделий 1000 мм, 2004 г. в.	1 302,89	130,29
26	**Переставитель угловой (трансфер) ТР-1,** инв. № 0000044231. Для упорядоченной передачи стеклотары с транспортера горячих изделий на транспортер переставителя, производительность 50 тш/мин., высота транспортируемых изделий 1000 мм, 2004 г. в.	1 302,89	130,29
27	**Рольган РЭ 500,** инв. № 44206. Предназначен для транспортирования готовых изделий, габариты 883х692х4176 мм, 2004 г. в.	1 267,24	126,72
28	**Рольган РЭ 500,** инв. № 44207. Предназначен для транспортирования готовых изделий, габариты 883х692х4176 мм, 2004 г. в.	1 267,24	126,72
29	**Рольган РЭ 500,** инв. № 44208. Предназначен для транспортирования готовых изделий, габариты 883х692х4176 мм, 2004 г. в.	838,85	83,86
30	**Транспортер ТЛЖ-400 18,2м,** инв. № 0000041593. Для транспортирования стеклобоя, производительность 13 т/ч, длина 18,2 м, ширина ленты 400 мм, мощность двигателя 11 кВт, 1000 об/мин, 2004 г. в.	925,74	92,57
31	**Транспортер ТЛЖ-400 18,2м,** инв. № 0000041592. Для транспортирования стеклобоя, производительность 13 т/ч, длина 18,2 м, ширина ленты 400 мм, мощность двигателя 11 кВт, 1000 об/мин, 2004 г. в.	925,74	92,57
32	**Загрузчик печи отжига 23П-18,** инв. № 0000044200. Для автоматической загрузки стеклоизделий в печь отжига, максимальная производительность 120 шт./мин., ширина сетки 1800 мм, габариты 4000х1400х1800 мм, 2004 г. ввода в эксплуатацию	6 496,27	649,63
33	**Загрузчик печи отжига 23П-18,** инв. № 0000044201. Для автоматической загрузки стеклоизделий в печь отжига, максимальная производительность 120 шт./мин., ширина сетки 1800 мм, габариты 4000х1400х1800 мм, 2004 г. ввода в эксплуатацию	6 496,27	649,63
34	**Питатель 1ПК-1552,** инв. № 0000044221. Для автоматического питания каплями стекломассы заданной массы, температуры и формы через равные промежутки времени, для машины ЗПВМ3, производительность 26 кг/мин., 2004 г. в.	24 650,16	2 465,02
35	**Питатель 1ПК-1552,** инв. № 0000044222. Для автоматического питания каплями стекломассы заданной массы, температуры и формы через равные промежутки времени, для машины ЗПВМ3, производительность 26 кг/мин., 2004 г. в.	24 650,16	2 465,02
36	**Транспортер «горячий» сетчатый ТГ-1/6,5с,** инв. № 0000044224. Для транспортирования стеклоизделий от автоматов выработки и дальнейшей передачи их на поперечный транспортер переставителя стеклоизделий (поворотным кругом), габариты 5500х690х9900 мм, 2004 г. в.	2 993,27	299,33
37	**Транспортер «горячий» сетчатый ТГ-1/6,5с,** инв. № 0000044223. Для транспортирования стеклоизделий от автоматов выработки и дальнейшей передачи их на поперечный транспортер переставителя стеклоизделий (поворотным кругом), габариты 5500х690х9900 мм, 2004 г. в.	2 993,27	299,33
38	**Упаковочная машина УПБ-1А,** инв. № 0000044204. Производительность 300 пак./ч, установленная мощность электродвигателя 1,09 кВт, нагревателей 20 кВт, габариты 4300х1240х1900 мм, 2004 г. в.	6 598,20	659,82
39	**Электротельфер Т10432,** инв. № 41798. Грузоподъемность 2 т, высота подъема 12 м, 2003 г. ввода в эксплуатацию	1 998,18	199,82
40	**Печь отжига ПКГ-323,** инв. № 0000044227. Производительность 2000 кг/ч, коэффициент автоматизации 0,75, расход электроэнергии 9,8 кВт/час, максимальная температура 873 °С, габариты 21540х3294х3960 мм, 2004 г. в.	83 097,44	8 309,74
41	**Печь отжига ПКГ-323,** инв. № 0000044228. Производительность 2000 кг/ч, коэффициент автоматизации 0,75, расход электроэнергии 9,8 кВт/час, максимальная температура 873 °С, габариты 21540х3294х3960 мм, 2004 г. в.	83 097,44	8 309,74

Местонахождение оборудования:

Могилевская область, Осиповичский район, р. п. Елизово, ул. Калинина, 6

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артёма, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 28.09.2023 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 10.00 до 11.00 **29.09.2023 г.** Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

При подаче заявления участник должен иметь: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и при себе иметь все данные по счету.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту №** ____ согласно извещению, в газете «Звязда» от 29.08.2023 г.

Участник торгов, желающий участвовать в торгах в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого лота.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителями аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 10 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в течение 20 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке.

Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: +375 232 32-46-47; 32-18-95; +375 29 170-46-47. сайт: ino.by • e-mail: auction-gino@ino.by

Продавец: ОАО «Гродненский стеклозавод» филиал «Елизово», Могилевская обл., Осиповичский р-н, р. п. Елизово, ул. Калинина, д. 6, к. 2. тел.: +375 29 343-52-18; +375 44 700-46-71

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

ВЕРХНЯДЗВІНСК І ВАКОЛІЦЫ

Старыя паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава — нашы праваднікі ў мінуўшчыну. На іх — і вуліцы Верхнядзвінска (ранейшая назва — Дрыса), добра вядомага ў нашай краіне гарадка паўночна-заходняй Віцебшчыны. Калі б мы тут вандравалі ў пачатку XX стагоддзя, то, вядомая справа, зазірнулі б на пошту і тэлеграф, у гарадское вучылішча, прайшліся б па Паштовай вуліцы, не абмінулі Старамаскоўскую вуліцу, дзе размяшчалася казначэйства... Зайшлі б і ў Касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі. А пасля накіраваліся адпачыць у Гарадскі сад... Усе гэтыя мясціны ёсць і на паштоўках у калекцыі нашага рупліваga збіральніка гістарычнай памяці.

Верхнядзвінскам паселішча Дрыса стала ў 1962 годзе. Упершыню мясціна гэтая згадваецца ў 1386 годзе ў Хроніцы Мацея Стрыйкоўскага. Якраз тады Дрысенскі замак захапіў і падпаліў князь Андрэй Полацкі. У Сярэднявеччы горад з ваколіцамі ўваходзіў у склад Полацкага княства, Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай. У 1772 — 1776 гг. Дрыса — у Полацкай правінцыі Полацкай губерні, затым — у Полацкім намесніцтве, Беларускай губерні. З 1801 года — у Віцебскай губерні... І з 1917 года на век паселішча хапіла адміністрацыйных перадзелаў. Да 1924 года Дрыса заставалася цэнтрам Дрысенскага павета. Пасля — цэнтр Дрысенскага раёна Полацкай акругі. З 1938 года раён у Віцебскай вобласці, а ў 1944 — 1954 гг. — ужо ў Полацкай. З 1954 года і да сёння — раённы цэнтр у Віцебскай...

Адміністрацыйная геаграфія па-свойму цікавая і не лішняя для пошукаў часам забытай інфармацыі. Крыніцы, архіўныя дакументы і перыядычныя выданні звязаныя, як правіла, менавіта з адміністрацыйным падзелам. А ў выпадку з Дрысай-Верхнядзвінскам пошук павінен быць асабліва карпатлівым. Сваю долю складанасці ўносяць і перайменаванне, шматразовыя далучэнні ці аднясенні да розных тэрытарыяльных адзінак. А самае галоўнае — жахлівыя па сваёй сутнасці падзеі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі гэтых мясцін, у Дрысе і ваколіцах... З 14 лютага да 20 сакавіка прыбалтыйскія і ўкраінскія калабарацыяністы правялі ў гэтых мясцінах у трохвугольніку Себеж — Асвея — Полацк карную аперацыю пад назвай «Зімовае чараўніцтва». Тысячы людзей былі забітыя, спаленыя... Яшчэ большая колькасць выведзена пешшу ў розныя часовыя канцлагеры, а затым перапраўлена ў лагер смерці Саласпілс пад Рыгай. Там жанчын адрывалі ад дзяцей і накіроўвалі на работы ў Германію... Былі знішчаны сотні вёсак. Толькі ў Асвейскім раёне (сёння гэтая тэрыторыя ўваходзіць у склад Верхнядзвінскага раёна) было спалена 183 вёскі, расстраляна і спалена 11 383 чалавекі (з іх 2 118 дзяцей ва ўзросце да 12 гадоў). І гэтыя лічбы недакладныя. Зазірнуўшы ў тую калатнечу і віхуру, цяжка нешта высветліць з высокай ступенню дакладнасці. Невыпадкова ў нашай краіне і сёння, праз многія дзесяцігоддзі, праводзіцца пошукавая работа па высвятленні ўсіх абставін генацыду беларускага народа...

Зазіраючы ў тыя драматычныя часіны, неўпрыкмет разважаеш пра тое, колькі б яшчэ талентаў выпеставала гэтая зямля ў дадатак да яркіх асоб, якія выраслі тут у XIX — XX стагоддзях. У самім Верхнядзвінску ў 1897 годзе нарадзіўся вучоны-юрколаг, пісьменнік і перакладчык Аляксандр Пальмбах, вядомы як адзін са стваральнікаў тувінскай нацыянальнай пісьменнасці, сааўтар «Граматыкі тувінскай мовы», «Асноў тувінскай арфаграфіі». У Тыве ў знак памяці пра нашага земляка названа адна з вуліц горада Кызыла. Верхнядзвінск — радзіма мастака, які працаваў у гістарычным і біблейскім жанрах, Ісака Аскназія (1856 — 1902), акадэміка Імператарскай акадэміі мастацтваў. Работы жывапісца ёсць у калекцыях Дзяржаўнага Рускага музея, Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Смаленскага дзяржаўнага музея-запаведніка, Курскай карцінnай галерэі імя А. Дэйнэкі, іншых музеяў і галерэй.

Асвея — радзіма члена Саюза пісьменнікаў СССР Генадзя Гародніка (1911 — 2000), які напісаў цыкл партызанскіх апавяданняў, тэматычна звязаных з Асвейскім краем. У Бендзялях непадалёку ад Бігосава жыў Эдуард Самуйлёнак (1907 — 1939), які нарадзіўся ў Пецярбургу, а пасля разам з сям'ёй перабраўся на радзіму. Адсюль, з Бігосава, у 1929 годзе пісьменнік быў прызваны ў Рабоча-сялянскую Чырвоную Армію. Аўтар аповесці «Тэорыя Каленбрун», зборнікаў апавяданняў «Пункт апоры», «Дачка эскадрона», «Паляўнічае шчасце», рамана «Будучыня». З Асвеі родам — і яўрэйскі савецкі пісьменнік Якаў Рывес (1886 — 1975). У гады Грамадзянскай вайны працаваў у бальшавіцкім падполлі Беларусі. Друкавацца пачаў у 1918 годзе. Аўтар кніг «Падполле» (1924), «Ян Дземба» (1935), дакументальнага рамана «Бальшавікі» (1965)...

Паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.

А колькі цікавага захоўвае ў сабе памяць вёскі Валынцы?! Побач з паселішчам, у фальварку Забелы, пры дамініканскім кляштары ў 1786 — 1811 гг. дзейнічалі калегіум і школьны тэатр. На сцэне тэатра здзяйсняліся пастаноўкі камедый, трагедый. Асноваў даволі часта служыў фальклорны матэрыял, які збіраўся ў ваколіцах. Захаваліся Забельскія зборнікі, складзеныя на беларускай, лацінскай і польскай мовах выкладчыкамі калегіума Міхалам Цяцерскім, Каятанам Марашэўскім, Ігнатам Юрэвічам. Дарэчы, п'есу «Камедыя», якую напісаў выкладчык калегіума Каятан Марашэўскі, ставілі ў розных варыянтах і ў мінскіх тэатрах у XX стагоддзі.

У 1811 годзе калегіум пераўтварылі ў гімназію, якая працавала да 1836 года. Дамініканскі касцёл быў разбураны ў канцы 1940-х гг. У гімназіі вучыўся паэт і драматург Арцём Вярыга-Дарэўскі, ураджэнец вёскі Кублічы Ушацкага раёна. А ўжо ў 1920-я гады ў Валынцах настаўнічаў пісьменнік Сымон Хурсік (1902 — 1972), аўтар зборнікаў апавяданняў «Першы паўстанак» і «Шляхамі навальніц», аповесці «Чорны мост». У 1930 г. малады літаратар скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне Белдзяржуніверсітэта, а ў ліпені 1930-га быў арыштаваны і высланы на пяць гадоў у Йашкар-Алу (Марый Эл). Працаваў настаўнікам у Марый Эл, Чувашыі, Казахстане. У час Вялікай Айчыннай вайны — на фронце. А ў 1947 годзе ізноў арыштаваны. Рэабілітаваны 13 кастрычніка 1958 года. З 1964 года жыў у Карагандзе, да літаратурнай творчасці ўжо больш не вярнуўся... З Валынцамі звязаны і лёс пісьменніка-франтавіка Тараса Хадкевіча. Тут ён вучыўся ў сямігодцы, у школьнай насценгазеце быў змешчаны першы яго верш — «Да новага жыцця».

Цікавы факт з гісторыі беларуска-расійскіх літаратурных сувязяў. У маёнтак Лісна (ёсць на Верхнядзвіншчыне такая вёска — Лісна), які набыў у 1773 — 1774 гг., прыязджаў рускі пісьменнік Дзяніс Фанвізін. У гэтым паселішчы ён працаваў над камедыяй «Выбар гувернёра». У 1780-я гг. Фанвізін здаў маёнтак у арэнду барону Ф. Медэму. А праз некаторы час падаў на яго ў суд з той прычыны, што арандатар выціскаў з маёнтка ўсё магчымае і немагчымае. Пасля смерці Фанвізіна маёнтак быў прададзены. З вёскі Мушына родам маці рускага празаіка Сяргея Сартакова (1908 — 2005), Героя Сацыялістычнай Працы, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, аўтара многіх кніг, якія ў савецкі перыяд выдаваліся шматмільённымі тыражамі.

Вандруючы па Верхнядзвіншчыне, згадваючы старадаўнюю Дрысу, зазірнуўшы ў Асвею і Валынцы, не абмініце іншыя вёскі і вёсачкі гэтай прыгожай старонкі Віцебскай зямлі.

Кастусь ЛЕШНІЦА.

ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ГУЛЬНІ Ў КРАКЕТ... У МОТАЛІ

Якія тайны адкрываюць архівы

Архівы Беларусі захоўваюць дакументы і матэрыялы, дзе шматгранна адлюстраваны гістарычны працэс, зафіксаваны асобныя факты, падзеі, імёны нашых суайчыннікаў. На аснове пісьмовых крыніц вучоныя ствараюць аб'ектыўную карціну мінулага, знаходзяць новыя звесткі, дапаўняюць уяўленні пра культуру і быт нашых продкаў. Работы ў архіве хопіць не аднаму пакаленню даследчыкаў, прычым яны могуць не толькі пашыраць звесткі пра раней вядомыя гістарычныя падзеі, але і спрабаваць па-іншаму паглядзець на былыя часы. Пацвярджэнне таму — навукова-практычная канферэнцыя «Архівы і архівісты: рух па шляху развіцця», якая прайшла ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі і была прымеркавана да яго 85-годдзя.

На канферэнцыі узнімаліся тэмы, прысвечаныя як гісторыі архіўнай справы, так і падзеям ды з'явам, што адбываліся ў розныя гістарычныя эпохі. Даследчыкі, якія дзяліліся сабранай у архівах інфармацыяй, паказалі, як дзякуючы пісьмовым крыніцам можна больш даведвацца пра грамадска-палітычнае жыццё, функцыянаванне органаў кіравання, развіццё прамысловасці і сельскай гаспадаркі, становішча этнаканфесійных супольнасцяў, станаўленне і развіццё фізкультурна-спартыўнага руху на беларускіх землях і многае іншае.

Пажары, сіроты і рабаўніцтва могілак

Дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ Зінаіда Антановіч прысвяціла свой даклад архівістам Мінскай праваслаўнай кансісторыі канца XVIII — сярэдзіны XIX стагоддзя. Сабраныя імі дакументы складаюць адзін з найбольш значных фондаў, які захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве. На сёння ў ім больш як пяць тысяч адзінак захоўвання. На жаль, гэта не ўвесь комплекс, згодна з запісамі сярэдзіны XIX стагоддзя дакументаў было больш. Дадзены архіў пачаў фарміравацца ў Слуцкім Троіцкім манастыры з 1785 года, а пасля цалкам увайшоў у склад Мінскай кансісторыі. Захаваліся запісы людзей, што працавалі з архівам, пра тое, калі дакументы былі страчаны. Напрыклад, падчас вайны 1812 года архіў вырашана было эвакуіраваць, яго нават давезлі да Ракава, але ў супрацоўнікаў кансісторыі канфіскавалі коней, і архіў быў вернуты ў Мінск. А вось у 1835 годзе падчас аднаго з самых страшных пажараў у Мінску, дзякуючы намаганням людзей, якія апекаваліся архівам, ён змог ацалець...

Малодшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі канца XVII — пачатку XX стагоддзя Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Кацярына Кімбар, якая даследавала дакументы фондаў дваранскіх апек, раскрыла тэму «Фінансавае забеспячэнне дзяцей-сірот у беларуска-літоўскіх губернях у першай палове XIX стагоддзя». Дзякуючы дакументам можна даведацца, хто апекаваўся аб дваранскіх дзецях, якія страцілі бацькоў, якія сумы выдаткоўваліся апекунамі і нават што набывалі юным паненкам-сіротам.

Вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Наталля Анофранка вырашыла даследаваць тэму, звязаную з рабаваннем могілак. У канцы XVIII стагоддзя ў Расійскай імперыі яно мела назву «трунакапальніцтва». Разам са святатствам (крадзяжом з царкоўных устаноў) такое злачынства лічылася кананічным. Яно разглядалася не толькі ў крымінальных судах, але і як злачынства супраць царквы. Вінаватых секлі пугай, вырывалі ноздры, ставілі кляймо на твары і высылалі на катаржныя работы. Наталля Васілеўна прыводзіла некаторыя эпізоды, знойдзеныя ў дакументах судовых устаноў Мінскай губерні. Адна з падобных спраў разглядалася Слуцкім магістратам. Муж рабаваў пахаванні на яўрэйскіх могілках, а яго жонка мыла рэчы нябожчыка, перашывала іх.

Часам могілкі раскопваліся не толькі дзеля нажывы. У XIX стагоддзі людзі маглі праводзіць з целам нябожчыка рытуалы, каб папярэдзіць няшчасці. У 1848 годзе сяляне вёскі Вялікія Жухавічы, калі пачыналася халера, вырашылі «прадухіліць эпідэмію» пры дапамозе рытуалу над целам дзяўчыны, якая першая памерла ад гэтай хваробы. Групу заўважыў святар і паведаміў пра яе паліцыі. Дадзеная справа дайшла да сената, а пасля і да самога цара, які вырашыў зменшыць пакаранне, бо палічыў, што людзі знаходзіліся ў нестабільным эмацыянальным стане перад эпідэміяй. Наогул гісторыі беларускага крыміналу можна прысвяціць цэлую кнігу і на мясцовым матэрыяле здымаць дэтэктывы.

Гісторыя пра коўры

Да XX стагоддзя гісторыя фізкультуры і спорту выпадала з поля зроку даследчыкаў. Хоць, як падзяліўся кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ Сяргей Бусько, у Нацыянальным гістарычным архіве захоўваецца вялікая колькасць дакументаў, якія дапамогуць вывучыць дадзеную тэму. Сярод іх матэрыялы, звязаныя з заканадаўствам, з адносінамі дзяржаўных органаў да згаданай сферы, статуты спартыўных арганізацый, справаздачы навучальных устаноў. Можна нават прасачыць, як мяняліся стаўленне ў грамадстве да фізічных заняткаў. Так, калі ў 1870-я гады трапляюцца дакументы з адмовамі на выдзяленне сродкаў і памяшкання для спартыўных заняткаў, то ў 1890-я, наадварот, прадпісваецца хутчэй развіваць такі кірунак. У архіве захаваліся матэрыялы 1913—1914 гадоў адной з устаноў, якая на беларускіх землях адказвала за развіццё спорту, што дазваляе казаць аб сістэмнай палітыцы. Збіралася справаздачнасць па колькасці людзей, якія займаліся фізкультурай і спортам. Напрыклад, вядома, што ў 1913 годзе толькі ў Віцебскай губерні фізічнай культурай займалася 53 тысячы чалавек.

У архівах можна знайсці спісы ўладальнікаў веласіпедаў па розных гарадах. Гэтыя людзі атрымлівалі на свой сродак руху асабістыя нумары, плацілі падаткі. Можна нават прасачыць, хто набываў веласіпеды. Сяргею Бусько трапілася справа аднаго з віцебскіх купцоў, які звярнуўся ў канцылярыю са скаргай на 15-гадовую дачку, што займела веласіпед. Маўляў, ёй у такім узросце нельга раз'язджаць па горадзе. У выніку яму прыйшлося набыць яшчэ тры веласіпеды — для сябе, жонкі і сына, каб катацца разам. І ездзіў ён да 1915 года, пакуль не пачалася Першая сусветная вайна і веласіпеды не канфіскавалі на карысць арміі.

Прынята лічыць, што футбол пачаў развівацца ў Беларусі з 1911 года. Тады прайшлі матчы, інфармацыя пра якія захавалася ў друку. Але яшчэ раней у мясцовых газеты ішла інфармацыя пра вынікі брытанскага чэмпіянату па футболе 1904 года, абмяркоўвалася цісканіна на стадыёне «Айброкс» у шатландскім горадзе Глазга, а ў Нацыянальнай акадэмічнай бібліятэцы Сяргей Бусько нават натрапіў на квіток на футбол 1910 года.

З 1898 года захаваліся справаздачы па ўсіх навучальных установах аб заняткаў спортам. Па прыватных картках вучняў можна прасачыць, хто якія паказваў вынікі. Гімназіі прапаноўвалі вучням летнія школы па два тыдні (гэта можна лічыць правобразам першых летніх лагераў) за кошт дзяржаўных устаноў і дабрачынных арганізацый. Дакументы сведчаць, як у пачатку мінулага стагоддзя развівалася інфраструктура: ствараліся футбольныя пляцоўкі, трэкі, яхт-клубы. Дарэчы, пляцоўка для гульні ў кракет у Моталі з'явілася раней, чым у Рэпіна ў Здраўнёве і ў Радзівілаў у Нясвіжы. З 1910 года ў Беларусі была свая фабрыка па вытворчасці спартыўных снарадаў, яе каталогі распаўсюджваліся па навучальных установах. Захавалася справаздача 1907 года з Гродна, што ў горадзе аказвалася 20 відаў паслуг: можна было прыйсці на футбольнае поле і ўзяць мячы, напракат здаваліся веласіпеды, яхты. Цікава прасачыць, як спорт мяняў грамадства, нават моду. Калі спачатку жанчыны ўдзельнічалі ў ціхіх веласіпедных спаборніцтвах, калі трэба было элегантна праехаць па парку, ужо праз некалькі гадоў адбываліся спаборніцтвы на хуткасць, якія патрабуюць зручнага адзення. Сукенкі ўкарочваліся, і жанчыны спрачаліся, ці будзе прыстойны такі касцюм...

На заметку даследчыку

Супрацоўнікі архіва актыўна дзеляцца знойдзенымі таямніцамі з чытачамі.

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў БССР распачаў навуковую дзейнасць яшчэ ў першыя пасляваенныя гады. У часы Савецкага Саюза навукова-публікатарская работа архіва па сутнасці заключалася ў выяўленні архіўных матэрыялаў, іх археаграфічнай апрацоўцы і падрыхтоўцы да друку разнастайных зборнікаў дакументаў. Яны пераважна рыхтаваліся архівам у супрацоўніцтве з іншымі арганізацыямі, часцей за ўсё — з Інстытутам гісторыі Акадэміі навук.

З набыццём Рэспублікай Беларусь незалежнасці і ўстанаўлення архіваў у цяперашнім выглядзе навукова-даследчая дзейнасць Нацыянальнага гістарычнага архіва выйшла на новы этап. Установа пачала весці навуковыя распрацоўкі і публікатарскую дзейнасць самастойна. Першым выданнем, зробленым у перыяд Незалежнасці, стаў зборнік «Магілёўскі магістрат. 1580—1581, 1588 гады». Гэтай кнігай Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі распачаў выдавецкую серыю пад назвай «Беларусь у актавых кнігах XVI—XVIII стст.». Яе галоўная мэта — азнаёміць шырокую грамадскасць з архіўнымі даследаваннямі гісторыі Беларусі перыяду Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, якія вядуцца непасрэдна ў архіве.

Таксама архівісты працуюць над такой тэмай, як генеалогія і геральдыка шляхецкіх родаў Беларусі. Першы том гербоўніка беларускай шляхты выйшаў у 2002 годзе. Сёння архіў працуе над падрыхтоўкай другой часткі 8-га і галоўная заслуга ў рэалізацыі праекта належыць намесніку загадчыка аддзела навукова-даследчай і публікацыйнай дзейнасці Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Яўгену Глінскаму. Гэтае навуковае выданне стала сапраўднай візітнай карткай архіва, выклікае зацікаўленасць у шырокіх колах грамадства. Людзі, якія цікавяцца гісторыяй нашай краіны, генеалогіяй, з нецярпеннем чакаюць кожнага новага тома.

Сапраўдны падзеяй стала выданне зборніка дакументаў «Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI стагоддзя (з актавых кніг Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі). Ён з'явіўся ў выніку шматгадовай працы работнікаў аддзела старажытных актаў НГА. У зборнік увайшло 116 дакументаў за 1559—1600 гады, унесеных у актавыя кнігі гродскіх і земскіх судоў. На момант выхаду кнігі падобных выданняў у Беларусі не існавала. Зборнік быў адзначаны дыпломам II ступені Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі».

У 2010 годзе Нацыянальным архівам была распачата серыя зборнікаў, прысвечаная дзяржаўным рэлігійным і грамадскім установам перыяду Расійскай імперыі. Кожны са зборнікаў, якія рыхтавалі архівісты, ахоплівае дакументы адной з беларускіх губерняў. У выніку даследчыкі атрымалі ўнікальныя для нашай краіны даведнікі.

Нацыянальны гістарычны архіў развівае і такі напрамак, як падрыхтоўка і публікацыя асобных комплексаў крыніц. Першым у гэтым шэрагу стала адна з метрык Вялікага Княства Літоўскага. На сёння падрыхтоўка чарговых тамоў праводзіцца архівам у партнёрстве з Інстытутам гісторыі Акадэміі навук.

У 2004 годзе, з ростам запыту ў грамадства на карыстанне дакументамі ў розных формах, у архіве быў створаны асобны аддзел публікацыі дакументаў. Сярод зборнікаў, падрыхтаваных даследчыкамі, — «Беларусь і вайна 1812 года», «Иностранные подданные в Беларуси (в конце XVIII — начале XX веков)».

Цяпер вядзецца распрацоўка тэмы, звязанай з чыноўнікамі беларускіх губерняў. Ужо ўбачыў свет даведнік, прысвечаны мінскім губернатарам і прадвадзіцелям дваранства. Вядзецца падрыхтоўка аналагічнага даведніка, прысвечанага віцебскім чыноўнікам.

Увага аддаецца і картаграфічным ды іканаграфічным матэрыялам, публікуюцца выяўленчыя дакументы з глыбокім і падрабязным аналізам, як, напрыклад, у кнізе «Абрысы розныя»: малюнкі і чарцяжы гетмана Януша Радзівіла». Убачылі свет зборнікі фатаграфій, выяўленых у архіве. Сярод іх выданні, прысвечаныя мінскім мужчынскай і жаночай гімназіям.

Сабраныя звесткі пра тысячы прадстаўнікоў духавенства. Імгненна разышоўся наклад кнігі, падрыхтаванай Дзянісам Лісейчыкавым, «Святар у беларускім соцыуме».

Сумесна з калегамі з расійскага Дзяржаўнага архіва старажытных актаў беларускія даследчыкі вывучаюць тэму сацыяльна-палітычнага руху ў XVII—XVIII стагоддзях.

Адшуканыя, асэнсаваныя, абагульненыя звесткі са старажытных крыніц запатрабаваныя ў студэнтаў, гісторыкаў, краязнаўцаў.

Ганна ПЯТРОВА.

З глыбіні стагоддзяў

Загадкі для дэтэктываў з рыдлёўкамі

Што новага знайшлі нашы археолагі

Нягледзячы на тое, што першыя сведчанні пра знаходкі старажытных рэчаў фіксуюцца XVI стагоддзем, сур'ёзныя падыходы да археалагічных даследаванняў на нашых землях пачалі развівацца толькі з другой паловы XIX стагоддзя. Пра тое, што насельніцтву часта траплялася старажытныя рэчы, сведчаць шматлікія запісы этнографаў, паданні пра «стрэлы Перуна» (так у беларускіх вёсках называлі старажытныя наканечнікі стрэл і каменныя сякеры).

Нездарма кажуць, што археолаг — гэта дэтэктыў, які спазніўся на месца злачынства на некалькі стагоддзяў. Сапраўды, падчас раскопак даследчыкі скрупулёзна супастаўляюць інфармацыю, адкрываюць новыя звесткі пра нашу гісторыю. Не стаў выключэннем і бягучы год. Ён багаты на знаходкі, якія не толькі пацвярджаюць летапісныя крыніцы, але і ставяць перад даследчыкамі новыя пытанні.

ПАПРАЎКА НА СТО ТЫСЯЧ ГАДОЎ

Так, на возеры Сялява ў Крупскім раёне падчас даследавання мезалітычнага пасялення была знойдзена жылая пабудова, якая, магчыма, адносіцца да IX тысячагоддзя да нашай эры. Гэта кундская культура. Дадзены археалагічны помнік, як ніякі іншы, багаты па колькасці артэфактаў, індывідуальных знаходак, якія важныя для інтэрпрэтацыі ды ідэнтыфікацыі комплексу. Дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Вадзім Лакіза ўпэўнены, што даследаванні на гэтым археалагічным аб'екце вартыя для ўключэння ў канцэпцыю нацыянальных праектаў, гэтак жа як і на стаянцы каля вёскі Агова. На апошняй падчас комплексных раскопак былі сабраны артэфакты ўзростам каля 200 тысяч гадоў. Гэта пацвярджае версію археолагаў, што першыя людзі пачалі засяляць нашы землі не сто тысяч гадоў таму, як лічылася раней, а ў больш раннія часы.

Міжнародная экспедыцыя каля вёскі Агова праводзілася айчыннымі археолагамі ў супрацоўніцтве з вучонымі Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры РАН (Санкт-Пецярбург) ды Інстытута геаграфіі РАН (Масква) і студэнтамі БДУ. На сёння гэта найстаражытнейшы на тэрыторыі Беларусі і адзін з самых старажытных ва Усходняй Еўропе археалагічны комплекс. Безумоўна, такі гістарычны аб'ект заслугоўвае права на ўключэнне ў нацыянальную канцэпцыю даследаванняў.

ЯКІ КНЯЗЬ ЗЛАМАЎ СВІСТУЛЬКУ?

Ужо не першы год праходзяць даследаванні на тэрыторыі Бешанковіцкага і Сенненскага раёнаў, на так званым мокрым пасяленні. Тут, на Крывіцкім тарфяніку ў залежах торфу збегрэлісь ўнікальныя артэфакты — без доступу кіслароду захаваліся арганічныя рэчывы, дзякуючы якім можна больш даведацца пра матэрыяльную і духоўную культуру пасялення эпохі неаліту і бронзавага веку. Раскопкі на крывіцкім тарфяніку — адны з самых складаных, да іх далучыўся цэнтр дайвінгу «Марскі пегас».

Цікавыя матэрыялы першабытнага часу знойдзены на пасяленні Чырвоная Горка Жлобінскага раёна. Гэта адны з раскопак, у якіх бралі ўдзел школьнікі. Таксама юныя археолагі далучыліся да даследаванняў у Гальшанах і Дзятлаўскім раёне.

Археолагі сочаць за правядзеннем рэстаўрацыйных работ на гістарычных аб'ектах. Так, калі летась у Полацку раскопкі вяліся на Верхнім замку, сёлета яны ідуць на месцы будучай рэканструкцыі полацкага стадыёна. Даследчыкаў уразіла, наколькі магутны культурны пласт тут захаваўся, і тое, што ён насычаны артэфактамі X—XII стагоддзяў. Рэстаўрацыйныя работы з удзелам археолагаў вядуцца на Навагрудскім і Крэўскім замках, раскопкі вяліся і на валах Мазырскага замка.

Цікавыя адкрыцці былі зроблены ва Ушацкім раёне пад кіраўніцтвам археолага Марата Клімава, дзе ў XII стагоддзі знаходзілася загародная рэзідэнцыя полацкіх князёў. Знойдзеная там свістулька, хутчэй за ўсё, зламаная яшчэ ў тыя часы. На ёй археолагі заўважылі выяву крыжа і купала. Дадзеная дэталь можа быць сведчаннем таму, што ў гэтых мясцінах бывала Еўфрасіння Полацкая.

ЦІ З'ЯВІЦЦА АРХЕАЛАГІЧНАЯ КАРТА?

Наогул сёлета Нацыянальнай акадэміяй навук было выдадзена 130 дазволаў на правядзенне археалагічных даследаванняў ва ўсіх абласцях Беларусі. Сёння ў Інстытуце гісторыі ў аддзеле археалогіі працуюць 42 спецыялісты, што, бясспрэчна, мала для вырашэння тых задач, якія ставіць дзяржава. Усё ж археолагі займаюцца вывучэннем гісторыі 300 тысяч гадоў: ад першых пасяленняў да больш позніх часоў. Апошнія гады актыўна развіваюцца новыя кірункі — выратавальная археалогія, археалогія ваенных канфліктаў.

Па даручэнні прэм'ер-міністра Рамана Галоўчанкі вучоныя падрыхтавалі канцэпцыю фарміравання і рэалізацыі найбольш значных археалагічных праектаў.

Пасля папярэдняй работы з органамі мясцовай улады, універсітэтамі яны ўключылі ў канцэпцыю найбольш цікавыя, важныя для гісторыі беларускай дзяржаўнасці аб'екты. У далейшым пасля ажыццяўлення даследаванняў і правядзення добраўпарадкавання гэтыя помнікі археалогіі маглі б быць запатрабаваныя ў сферы турызму.

